Фактически никто из преследователей Бабича, виновных в его злоключениях, не пострадал, хотя по закону и совести все они должны были бы возместить оправданному судом человеку и огромные материальные потери, и не менее крупный моральный ущерб. Последний, кстати, следовало бы взыскать не только в пользу Александра Бабича, но и его родителей, и его деда с бабушкой, и, конечно же, в пользу его жены, которая, испугавшись налетчиков из милиции, чудом не потеряла ребенка, и еще не известно, как отразится тот испуг на здоровье Сашиного первенца.

Все случившееся с Бабичем было бы невозможно, если бы районные милицейские начальники не надеялись на поддержку областного и столичного руководства.

В середине лета 2008 года, когда в судебном процессе по уголовному делу А.Бабича наметился перелом в его пользу, житель Постав, кандидат в депутаты Палаты представителей Национального собрания Беларуси Владимир Боровко, который по просьбе семьи Бабичей присутствовал на всех судебных слушаниях, обратился в УКГБ по Витебской области с заявлением, где сообщил, опираясь на материалы судебного дела, что в Шарковщине под "крышей" РОВД беззаконно действует группа торговцев крадеными нефтепродуктами. Из УКГБ письмо В.Боровко было отправлено в облпрокуратуру, а ответ заявителю пришел от начальника УВД. В.Боровко изумленно прочитал, что изложенные в письме факты "проверены, но не нашли своего подтверждения".

Не помогли А.Бабичу и высокие чины МВД, куда по наивности обращался он со своей правдой. Как видно, в ведомстве тогдашнего министра В.Наумова, которое в последнее время "прославилось" коррупционными скандалами, востребованы именно такие, глухие к правде и справедливости, служащие, как Буко и Барадулин, и отнюдь не уместны такие, как Александр Бабич, — преданные делу, верные присяге и долгу, закону и принципам человечности. Таких в нашей огромной милиции мало. Так не потому ли, подводя итоги 2008 года, нынешний начальник УВД Александр Найденко с неудовольствием констатировал, что по раскрываемости уголовных преступлений с показателем 40% Витебское УВД заняло одно из последних мест в Беларуси?

Есть над чем задуматься, прочитав сегодняшнюю публикацию, молодым людям, которые мечтают служить в милиции, полагая, что в этом ведомстве нужны светлые головы, чистые руки и горячие сердца, как поначалу думал наивный и честный Александр Бабич...

Выйдя на свободу после полуоправдательного приговора судьи Н.Вашкеля, А.Бабич смог устроиться только в службе соцзащиты района социальным работником по уходу за своими престарелыми бабушкой и дедом с зарплатой в 220 тысяч.

— Он чувствует себя в неоплатном долгу перед стариками, ездит к ним в деревню каждый день, — говорит о сыне Ирина Северьяновна. — Когда начались судебные разбирательства, наши враги думали, что мы не справимся с расходами, так как в это время Сашин отец потерял работу. Вот здесь-то и выручили старики, родители мужа. Они отказывали себе во всем, а свои пенсии отдавали на судебные издержки. Саша, конечно, ухаживал бы за ними и бесплатно, однако заработок ему положен по закону. А отказываться от него глупо, когда твоей семье не на что жить: Светлана получает по уходу за ребенком 180 тысяч — еще меньше, чем Саша за свою опеку над родными-инвалидами.

12 октября 2009 года Александру Бабичу исполнится 30 лет. Совсем немного останется ему (не сочтите за кощунство!) до возраста Иисуса Христа. Но своя Голгофа у него была, и прошел он этот мучительный путь достойно. Пожелаем же ему поскорее добиться максимального успеха в достижении победы закона и справедливости!

Сергей БУТКЕВИЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info 12—14 МАЯ 2009 г.

ПОЛНЫЙ АБЗАЦ

Возродили...

Каждый год посещаю на Радуницу свою малую родину - деревню Стапурево в Оршанском районе. Несколько лет назад, когда началось "возрождение села", в этой деревне построили 4 дома - два в конце деревни, под крышу, а два в центре, под ключ. Те, что в конце, все эти годы потихоньку разбирались, растаскивались, и теперь на их месте маленькие кучки кирпича. Другие два домика заселили. В одном жила женщина с ребенком, завела огород, держала поросенка. Потом ферму перевели в другую деревню, и женщина уехала. В этом году я увидела вместо дома один фундамент. Но и его скоро не будет. Когда я смотрю белорусское телевидение и слушаю радио, то кажется, что все делается толково и экономно. Но когда я вижу, что происходит в самой жизни, ни толковости и экономности не нахожу.

Мария ШЛЫК, жительница Пинска.

Пусть торжествуют в пустоте

Уместно вспомнить универсальный принцип А.Солженицына: если не можешь противостоять злу, то хотя бы не участвуй в создании и распространении зла. Нужно создать атмосферу гражданского неприятия того зла, которое исходит от властной вертикали. Она понастроила ледовых дворцов? Так пускай они пустуют. Ведь не нужно особого мужества, чтобы найти причину отказаться от покупки билетов на хоккей, когда их навязывают на предприятии, в учебном заведении. Нужно уклоняться от всяческих подписок, лотерей. Нужно добиться, чтобы в молодежной среде стало модным "откосить" от любого официального мероприятия властной вертикали. "Они" решили провести парад, а мы повернемся к ним спиной, не пойдем на площадь вместе с ними. Проведем свою маевку без них, отдельно. Пускай они торжествуют на пустой площади.

Николай ЛИПУНОВ, пенсионер по возрасту, житель Бобруйска.

ПАЗІЦЫІ

Абапірацца трэба на народ

Мноства слоў гаворыцца цяпер пра стан беларускай апазіцыі. Некаторыя ставяць ёй мінімальную адзнаку, кажуць, што яна слабая. Другія, напрыклад, Лябедзька, не губляюць аптымізму, гавораць, што яна не слабейшая і не мацнейшая, чым у папярэднія гады. На маю думку, яна стала слабая. І вось чаму.

Плошча — люстэрка апазіцыі

Пры аўтарытарным рэжыме, які склаўся на Беларусі, вулічныя акцыі — адзіны сродак барацьбы. Чым больш людзей на плошчы, тым мацнейшая апазіцыя. А што мы бачым? Калі лічыць з 2006 года, то колькасць людзей, якія рэагуюць на заклікі дэмакратаў, дынамічна падае. Ні адзін палітык, ні адна партыя ці рух не ўзнялі гэта вострае пытанне.

Апазіцыя стала дэцэнтралізаванай

Партыйныя дзеячы не павінны забывацца, у якой краіне яны жывуць. Ім трэба забыцца пра свае амбіцыі, перастаць быць удзельнымі палітычнымі князькамі. Не капрызнічаць, а калі трэба, саступіць дарогу другім лідэрам, пайсці на другі план і працаваць на адну справу. Напрыклад, у нас аж тры сацыял-дэмакратычныя партыі. І кожная аказвае вельмі нязначны ўплыў на грамадства. А калі б яны аб'ядналіся ў адну, была б зусім іншая справа.

Апазіцыя моцна скіравана на Еўропу

Яшчэ ў канцы 90-х з Еўропы зрабілі "свяшчэнную карову", бо яна ўсё ведае і заўсёды дапаможа. На падзеі, якія адбываюцца ў краіне, перш за ўсё чакаецца рэакцыя Захаду, і нікому не патрэбна рэакцыя народа. Пра што казаць, калі на парламенцкіх выбарах галоўным для дэмакратаў было непрызнанне Захадам новага парламента легітымным. А ці прызналі абраны парламент легітымным шараговыя беларусы? Мусіць, прызналі, калі так мала людзей выйшлі на плошчу пратэставаць. Успамінаецца выпадак, калі яшчэ падчас агітацыі Партыя БНФ збіралася зняць сваіх кандыдатаў, але ў СМІ прагучала выказваннеДжонатана Мура, што трэба ўдзельнічаць да канца, і партыя хутка змяніла сваё рашэнне. Сёння Еўропа пайшла на супрацоўніцтва з рэжымам, і няўзброеным вокам бачны ўсе гэтыя недарэчнасці дэмакратаў.

Апазіцыя мала працуе з народам

Калі жыхары Мінска і іншых буйных гарадоў маюць хоць нейкую інфармацыю, то ў рэгіёнах усё глуха. Дэмакраты актывізуюцца толькі падчас выбарчых кампаній, забываючыся, што працаваць з людзьмі трэба паўсядзённа, што менавіта ад гэтага залежыць вынік на выбарах. Мала надрукаваць улёткі з простымі заклікамі. Трэба збіраць і даводзіць да людзей канкрэтныя факты злоўжывання чыноўнікамі службовымі паўнамоцтвамі, парушэння правоў чалавека, звяртаць увагу на сацыяльныя пытанні і не забывацца пра нацыянальныя. Сёння людзі проста баяцца звязвацца з апазіцыяй, адчуваючы сваю залежнасць ад улады і неабароненасць. Адразу магчыма ўзгадаць выпадак з Аляксандрам Мехам, які застаўся адзін на адзін з уладай. А калі б апазіцыя дапамагла яму маральна і матэрыяльна, зусім іншае ўражанне аб ёй засталося ў людзей, не было б ім так боязна яе падтрымліваць.

***

Дзве высновы. На гэты момант беларускай гісторыі апазіцыя павінна аб'яднацца ў адну палітычную структуру, **якой павінен кіраваць адзіны лідэр**.

Абапірацца трэба не на Захад, не на Усход, а на свой народ.

Дзмітрый ЧАЛЕВІЧ.

г. Капыль.

Адарвіцеся ад канапы, крытыкі!

Даволі часта чытаю ў "Народнай Волі" ды іншых выданнях лісты і артыкулы з жорсткай крытыкай у адрас нашай апазіцыі, абвінавачанні яе ў слабасці, нікчэмнасці, нараканні на тое, што яна ўжо не ў стане нешта змяніць у краіне. Не з'яўляючыся сябрам аніводнай апазіцыйнай партыі ці арганізацыі, усё ж не магу не выказаць нязгоду з такімі нападаючымі.

Гэта вельмі проста — сядзець на канапе ці хавацца недзе ў прасторы інтэрнэт-форумаў і разважаць аб нежыццяздольнасці апазіцыі, пачуўшы часам аб чарговым яе правале на так званых "выбарах" альбо мітынгах і шэсцях, на якія зноў прыйшло мала людзей. Але ці задумваліся гэтыя "канапныя" крытыкі, што значыць быць сёння ў апазіцыі? Ці падумалі яны аб тых пераследах, якім увесь час падвяргаюцца апазіцыйныя актывісты; аб пастарунках, праз якія прайшлі сотні не згодных з рэжымам; аб зніклых палітыках; аб немагчымасці ўладкавацца на нармальную працу і рэалізаваць свае здольнасці, аб звальненнях за ўдзел у апазіцыйных мерапрыемствах; аб суцэльным непаразуменні і нават варожасці з боку так званай большасці...

Нараканне апазіцыі за бяздзеянне лёгка, але хай бы тыя, хто на кожным вугле дае ёй бясконцыя "парады", самі паспрабавалі б зрабіць што-небудзь ці хаця б падтрымалі дзеянні апазіцыі. Уявіце сабе, што кожны, хто не згодны з рэжымам, падняўся з канапы і прыйшоў на Дзень Волі 25 сакавіка і на "Чарнобыльскі Шлях". Не 2—3 тысячы, а 20—30 тысяч было б як мінімум! Ні ўлада, ні "канапныя" крытыкі не сталі б тады крычаць аб слабасці апазіцыі, яе раздробленасці. Мне, магчыма, запярэчаць, што ўсе гэтыя мітынгі і шэсці нічога не вырашаюць і ўвогуле не маюць сэнсу. Мой адказ такі: не мае сэнсу сядзець на канапе ў той час, калі нехта ўздымае бел-чырвона-белы сцяг, рызыкуючы быць збітым і атрымаць штраф за выкарыстанне недазволенай сімволікі. У нас чамусьці вечна чакаюць, што нехта прыйдзе і ўсё за нас зробіць — і свабоду падорыць, і новую ўладу разам з дэмакратыяй... Чакаюць, што аднекуль з'явіцца моцная апазіцыя. Не, так ніколі не будзе, пакуль чалавек сам не пачне нечага дамагацца, за нешта змагацца, не чакаючы "манны небесной".

Часта даводзіцца чуць, што беларуская апазіцыя нейкая эфемерная. А якой яна яшчэ можа быць, калі пры маўклівасці грамадства яна, можна сказаць, наогул адхілена ад удзелу ва ўладзе. У суседняй Украіне, Малдове, Грузіі, нават у Расіі апазіцыйныя дзеячы займаюць месцы ў парламентах і іншых кіруючых органах, яны ў стане нешта вырашаць і аказваць уплыў на жыццё грамадства. Быць апазіцыянерам у гэтых краінах не з'яўляецца нечым незвычайным. У нас жа можна лічыць сябе ледзьве не героем. Бо быць у беларускай апазіцыі азначае, што над табой будзе заўсёды вісець меч рэпрэсій. Таму ў апазіцыі знаходзяцца людзі з трывалымі перакананнямі, моцныя духам, зусім не эфемерныя, як сцвярджаюць "канапныя" крытыкі.

Прычыну ў тым, што апазіцыя раз'яднаная, я бачу не ў самой апазіцыі. Зразумела, што ў ёй, як і ў любой супольнасці, ёсць асобныя дзеячы, для якіх галоўнае не змаганне за дэмакратыю, а рэалізацыя асабістых амбіцый. Гэта, безумоўна, выклікае спрэчкі і канфлікты ў стане апазіцыі. Аднак галоўную прычыну адсутнасці адзінства і моцы ў апазіцыйным руху бачу ў нашым беларускім грамадстве. Як можа быць моцнай і адзінай апазіцыя ў грамадстве, для якога яна нейкая варожая "пятая колонна"? Дзяржаўная прапаганда зрабіла сваю чорную справу. Аднак жа і грамадства, як мне падаецца, не імкнецца ні да праўды, ні да свабоды, ні да перамен. Хаця апошнім часам шмат дзе можна пачуць незадаволенасць дзеяннямі ўлады, усё ж адчуваецца, што беларусы ў масе сваёй зусім не прагнуць кардынальных змен у сваім жыцці і жыцці краіны. Няма пачуцця агульнага пратэсту, а ёсць толькі абыякавасць і жаданне людзей, каб іх не чапалі ні ўлады, ні апазіцыя.

Дык якую моц можа мець апазіцыя пры амаль што суцэльным раўнадушшы грамадства?

Я не ведаю, да якога крызіснага становішча павінна дайсці наша краіна, каб адбыўся зрух у свядомасці большасці людзей. Толькі тады, калі абудзімся ад летаргічнага сну, у нас наладзіцца моцны апазіцыйны рух. А дагэтуль мы будзем мець тое, што маем. І ў гэтым сэнсе жорсткая крытыка існуючай апазіцыі, шматлікія "парады" таксама не маюць рацыі.

Што ж рабіць тым, хто ўжо сёння прагне перамен і не жадае мірыцца з рэжымам? Як ні банальна гучыць, адказ такі: набрацца цярпення і чакаць. Але ж гэта зусім не азначае, што чакаць трэба на канапе, што нам, людзям неабыякавым да лёсу Беларусі, трэба сядзець, склаўшы рукі. Наша задача — захаваць дух свабоды ў сэрцах, падрыхтаваць да змагання моладзь, пачынаючы з уласных дзяцей і ўнукаў, не скарыцца абставінам, якімі б цяжкімі яны ні былі.

Мы хадзілі і будзем хадзіць на мітынгі і шэсці, падтрымліваць апазіцыйныя акцыі і мерапрымствы, каб рэжым не расслабляўся і ведаў, што ён не бясконцы. Бо нам, менавіта нам, належыць зберагчы і данесці будучым пакаленням праўду аб сённяшнім дне і родную беларускую мову — аснову незалежнасці краіны і ўмову захавання нацыі.

А.МАРОЗАЎ.

г.Старыя Дарогі.

ВЕБ-САЙТСКАЯ ИСТОРИЯ

«Евгений Шигалов внес в белорусский бюджет больше 11 миллиардов белорусских рублей»

("НВ" №№63—64 за 24.04.2009)

Карпуша: Так есть же деньги... Зачем тогда министр труда и соцзащиты всеми правдами и неправдами стремится протащить и узаконить свою "бредовую" идею лишения пенсий работающих пенсионеров? Почему размер пособия по безработице 47 тыс. белорусских рублей? Почему урезали зарплаты и социальные выплаты? Ведь есть же деньги!!! И деньги немалые!!!

Еврей: Это ж сколько лет моей семье нужно работать в маленьком холодном складе, чтобы собрать такие деньги? Понимаю, КАК БОЛИТ СЕРДЦЕ, когда у тебя забирают "ЗАРАБОТАННЫЕ" деньги...

«Курапаты: на мяжы Памяці і бяспамяцтва»

("НВ" №№65—66 за 30.04.2009)

Я: Вельмі моцны артыкул. Сухія факты і нічога акрамя праўды. Калі б у "НВ" усе артыкулы былі падобныя на гэты, дык не грэх было б купляць газету...

Святлане КЛІМЕНЦЕНКА +1000 за артыкул!

«Кто поможет детям войны?»

("НВ" №№67—68 за 5.05.2009)

Elio: Это наша горькая правда, но кому надо ее видеть, смотрят сквозь...

«У Беларусі адкрыта дзейнічаюць злачынныя групоўкі... Спыніце!»

("НВ" №№67—68 за 5.05.2009)

Антон: Які жах! І гэта адбываецца ў самым сэрцы Еўропы!

Кастусь: Гэты ліст сведчыць аб тым, што "эскадроны смерці", якія скралі і забілі палітыкаў 10 гадоў таму, дзейнічаюць і зараз, толькі каманды ім аддаюцца пакуль іншыя. Будзем маўчаць, рабіць выгляд, што нічога страшнага не адбываецца?

«Утомление китчем»

("НВ" №№69—70 за 8.05.2009)

Сергей Козак: Чем интенсивнее будет развиваться общество, тем быстрее будут забываться народные обряды и традиции. Закон жизни! Общество эволюционирует, и эта эволюция носит направленный характер к социальному усовершенствованию. По ходу процесса будут выпадать утратившее свое значение такие социальные признаки, как обряд и традиции, более характерные для представителей палеолита и начала антропогена. И ничего тут не поделаешь — закон не нами писан!

Седицкий: ...в советские времена только отдельные Сыны, ПУСТЬ И С ПАРТБИЛЕТОМ, шли на Радуницу к могиле отца... Тогда также отдельные мыслители говорили о вырождении, и они же намекали о "НЯЧЭСНЫМ" члене КПСС... Так и сейчас для одного Радуница (не полностью православный праздник) — повод убрать могилу, а для другого — идея увеличить дозу потребляемого алкоголя на среднестатистическую душу населения Беларуси.

Кнехт: Адносна вянкоў і помнікаў пры дарогах згодзен з аўтарам: калі не спыніць гэты "рытуал", дык хутка будзем ездзіць быццам па могілках. А вось Радуніцу з салатам аліўе на магілах зразумець можна: народ выхваляецца перад продкамі, як яны зараз добра жывуць — ежы, маўляў, ад пуза...

«Дан старт «Восточному партнерству»

("НВ" №№69—70 за 8.05.2009)

Дмитро з Києва: Сподіваюся, що нехай навіть через декілька десятиріч, Білорусь та Україна стануть членами Європейського Союзу та Північноатлантичного альянсу, демократичними, цивілізованими країнами з розвинутим громадянським суспільством. Слава Білорусі! Слава Україні! Героям слава!

Як бабруйскія аплаквальнікі СССР абразілі Алеся Адамовіча

("НВ" №№69—70 за 8.05.2009)

Оглоблин: Ну, что обижаться на старых "пер...нов", на высказывания в адрес А.Адамовича, у них, видно, в Бобруйске есть "хороший" учитель, который также учился на поэзии В.Быкова.

Время их вылечит!

Кнехт: Рана яшчэ называць вуліцу ў гонар Алеся Адамовіча — няхай сыдуць "ветэраны СССР" у гісторыю...

ПРЕДЛАГАЮ!

Пригласить в Дом милосердия

В Минске с помощью государства и, я слышала, бизнесменов построен Дом милосердия. Хочу обратиться к Митрополиту Минскому и Слуцкому Филарету: проявите великодушие и милосердие к семье Радкевич, найдите возможность дать пожить в этом Доме этой семье, чтобы отец семейства смог найти работу. Как может семья из четырех человек прожить на пособие в 500 тысяч рублей?! Да еще имея на руках младенца Никиту, которому так много сейчас нужно.

Государство, строя всевозможные дворцы, не может устроить жизнь первой в Беларуси пациентке с пересаженным сердцем! Может, церковь найдет возможность взять эту семью под свою опеку.

С уважением

Ольга ВАРАКСА, пенсионерка.

Минск.

Очистить лес от завалов

Известно, в каком состоянии находятся наши леса. Скажу только, что по живым деньгам ходим. Продираемся! Проблеме десятки лет, но с нашим подходом к ней, с нашими "кадрами" мы никогда не очистим лес от завалов, гниющей древесины и вредителей. Речь не о промышленной заготовке, это функция леспромхозов. Речь о санитарной рубке. Почему бы нам не попытаться решить эту проблему сейчас, в кризисной ситуации. Ведь лес для нас — то же, что нефть и газ для России. Только сделать это нужно, по-моему, с помощью западного капитала. Пусть именно он придет в наш лес и возьмет так нужную ему пропадающую древесину.

Но тут важно вот что: в лес нужно пустить только целиком "импортные" бригады. С их техникой, инструментом и, самое главное, их культурой труда. Оговорив, конечно, твердыми техническими условиями требования к делянкам и лесу после "зачистки".

По-моему разумению, если этим бригадам за их труды отдать пятую часть заготовленной древесины, то это возместит их затраты и сделает их Gescheft достаточно выгодным. А четыре пятых можно тут же, на месте, продать им и получить так нужную нам валюту. Не "деревянную", но на дереве, так сказать...

При этом, уверен, пришлые бригады не только покажут нашим "ударникам", как можно и нужно работать, причем без "зеленого змия", но и создадут новые рабочие места. И за какой-нибудь пяток лет оздоровят наши леса, что нам не удавалось на протяжении жизни нескольких поколений.

Михаил ГОРЕЛИК.

Минск.

ЛОХОТРОН

Птичка капнула в наперсток

На днях встретил знакомую, всю в радостном изумлении:

— Представляешь, выиграла в "Суперлото"! Аж 405 тысяч!

На билете, который она мне показала, после стирания защитной пленки проявились три ряда цифр: 200000, 200000 и 5000. У меня возникли смутные подозрения: почему три цифры, а не одна — 405 тысяч? Вернулись к продавцу уточнить выигрыш и услышали: "Вы ничего не выиграли. Надо, чтобы все три цифры были одинаковыми. Но ваш билет продолжает играть..."

Во что? Нарисовали бы вместо трех цифр одну фигу. Коротко и ясно.

Впрочем, и я решил проверить госпожу Удачу, тоже купил билет. Опять три цифры, на сей раз одинаковые: 2000, 2000, 2000. И сколько ж я выиграл? "Две тысячи", — поздравил меня продавец. Так билет же стоит 4 тысячи, какой же это выигрыш? И снова в утешение: билет продолжает играть. Как говорят белорусы, "памяняў быка на індыка"...

О сути всех этих лотерей очень образно высказалась одна сельская бабка: "Вот если уставить поле наперстками игроков, то выиграет лишь тот, в чей наперсток капнет пролетающая птичка..."

Этих "удачников" показывают по телевидению, прославляют в популярных газетах, а сотни тысяч неудачников остаются в тени. Конечно, никто не неволит, можешь не играть. Но, наблюдая за покупателями билетов, не так уж трудно заметить, что деловые серьезные люди проходят мимо. Покупают же в основном люди малообеспеченные, которые, можно сказать, сами купились на эту удочку, надеются хотя бы таким образом улучшить свое материальное положение. И над такими людьми организаторы лотерей позволяют себе издевательские "шутки" вроде "трех цифр"!

"Суперлото" действует под крышей Министерства спорта и туризма и, вероятно, что-то отчисляет министерству, а министерство, используя разочарование сотен тысяч неудачников, строит ледовые дворцы. Уместно здесь напомнить о таком понятии, как совесть.

Служители церкви, организуя сбор пожертвований для строительства храмов, устанавливают в людных местах специальные прозрачные ящики. Почему бы и организаторам "Суперлото" не установить такие ящики для строительства тех же ледовых дворцов? Это было бы действительно прозрачно, то есть порядочно и честно.

Милиция преследует гадалок и наперсточников на вокзалах и в других людных местах, в России вон судили Мавроди за организацию финансовой пирамиды, а наши "шутники" процветают.

Михаил ГОЛЫНКА.

Минск.

ЧАЛАВЕК — ЧАЛАВЕКУ

Бацюшка з Нагародавіч



Вёска Нагародавічы раскінулася паблізу ад шашы, што вядзе са Слоніма ў Ліду. Калісьці гэта была даволі вялікая вёска: некалькі вуліц, цэнтр калгаса, клуб, пошта, васьмігадовая школа. Была і царква, але ў страшэнным запусценні, не працавала. Цяпер працуе толькі царква.

Пяць гадоў таму прыехаў сюды служыць айцец Іаан (Іван Яровіч) з матушкай Наталляй. І нейкім новым светам заззяла навокал, нейкім новым паветрам задыхалі мясцовыя жыхары.

Царкву, перш-наперш, памалявалі ў светлы колер, на прасторным двары пасеялі кветкі, паставілі лаўку, каб прыхаджанам было дзе адпачыць... Простыя, невялічкія быццам бы справы, але адразу стала светла, чыста, утульна.

А прыход у айца Іаана вялікі: адзінаццаць вёсак. Толькі вось людзей у тых вёсках засталося зусім мала. Ды што казаць пра далёкія лясныя бандары ці Вусце, калі ў саміх Нагародавічах шмат пустых хат, няма ніводнага дзіцяці. Састарэлым жа прыхаджанам бывае цяжкавата дабрацца да храма, тады айцец Іаан сам падвозіць іх на сваёй машыне. І людзі ачышчаюцца тут душой, стаяць на службе як зачараваныя. А потым гавораць:

— Як жа цудоўна было! У бацюшкі і матушкі такія прыгожыя галасы, яны так хораша співаюць, што душа замірае...

Але не толькі прыгажосцю галасоў набылі свой вялікі аўтарытэт у людзей бацюшка з матушкай. Усе бачаць, што нічым яны не адрозніваюцца ад простых сялян, як і яны, у поце здабываюць свой хлеб надзённы.

У свой час айцец Іаан набыў спецыяльнасць трактарыста, потым скончыў тэхнікум, дзе вывучыўся на механіка. Так што з тэхнікай ён, так бы мовіць, на "ты". Купіў трактар, але не толькі для сябе — не шкадуючы часу, дапамагае прыхаджанам у самай цяжкай рабоце: садзіць бульбу, апрацоўваць яе, а восенню капаць. Як жа рады гэтаму вяскоўцы! На прысядзібных участках калгаснай тэхнікі не дачакаешся, а айцец Іаан нікому не адмаўляе. Салярка, зразумела, нямала каштуе. Але ж плату, якую бацюшка-трактарыст бярэ за сваю працу, нават цяжка параўноўваць з афіцыйнай, такая яна малая. А з адзінокіх састарэлых жыхароў сваёй вёскі і ўвогуле мізэрная — хто колькі дасць. І напамінаць, што надышоў час акучваць бульбу ці каларадскага жука труціць, не трэба: сам усё зробіць, а восенню выкапае...

Калі ў Нагародавічах першы раз ім паказалі, так бы мовіць, службовае жыллё, схапіліся за галовы: на дварышчы быў такі бур'ян, нібы яго спецыяльна тут вырошчвалі, прыйшлося нават спілоўваць яго бензапілой. Затое цяпер тут усялякая гароднiна, садовыя ягады...

Можна ўразіцца чысцінёй і парадкам, якія пануюць і на сядзібе айца Іаана, і ў самой хаце. Невысокі ганак засланы прыгожай светлай посцілкай, на якой ані кропелькі бруду. Чысцінёй дыхае на верандзе, у пакоях... Кажу пра гэта матушцы Наталлі.

— Я спаць не магу, калі ў мяне што-небудзь недароблена, — яе прыгожы твар асвятляе лагодная ўсмешка. — Мы наогул любім працаваць. А як жа інакш?..

І сапраўды, такой працалюбівасці, як у гэтых людзей, можна толькі пазайдросціць ды павучыцца ў іх. У прыватнай гаспадарцы айца Іаана і матушкі Наталлі ёсць і свінні, і куры, і сорак сотак пад бульбу ў полі і дваццаць ля хаты...

— Мы ніколі не кладземся спаць раней апоўначы, а зранку ўжо на нагах, — кажа матушка Наталля.

Думаю, не памылюся, калі скажу, што наўрад ці хто ў Нагародавічах так шмат працуе. І здзіўляцца тут не выпадае — абодва гадаваліся ў вёсцы, змалку да работы прывыклі. Айцец Іаан — з Бярозаўскага раёна паходзіць, матушка Наталля — са Століншчыны. Такія ж працавітыя іх сын Руслан і нявестка Вікторыя, якія жывуць у недалёкім пасёлку Гезгалы, такімі ж выхоўваюцца і двое ўнукаў.

І ўсё ж ёсць у жыцці з'явы, якія непакояць айца Іаана. Найбольш балючая з іх — выміранне вёскі, абыякавасць многіх сельскіх жыхароў, асабліва маладых, да працы, самагубнае п'янства.

Аднойчы, каб наварыць есці жывёле і птушцы, айцец Іаан прывёз на сядзібу восем трактарных прычэпаў дроў. Папілаваў, пакалоў. То некаторыя вяскоўцы, што ўшчэнт спіліся і не маюць чым прапаліць у печы, ходзяць да яго красці. І не толькі дровы. І не так шкада свайго дабра, як вяскоўцаў, што прадалі душу алкагольнаму д'яблу. Не шукаюць ратунку ад згубы, клапоцяцца толькі аб адным: дзе знайсці чарговую бутэльку самага таннага віна, бо на лепшае няма грошай.

Ад такіх паводзін горка і прыкра на душы ў айца Іаана, заўсёды моліцца ён у храме за выратаванне іх душ. І ўжо адчуваецца, як малітва гэта і ўласны прыклад патроху ўплываюць на тых, хто страціў у жыцці сэнс.

...Калі нядаўна я наведвала айца Іаана і матушку Наталлю, гаспадар збіраўся на радзіму на пахаванне цёткі. У доме раз-пораз званіў тэлефон: людзі прасілі ўзараць агароды, пасадзіць бульбу.

— Скажы, што я праз пару дзён прыеду і ўсё зраблю, — наказваў ён матушцы. І ў гэтых словах была шчырая заклапочанасць святара і селяніна аб блізкіх, аб зямельцы, якая прачнулася ад зімовага сну і чакае руплівых рук.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

З БЕРЛІНСКАГА БЛАКНОТА

60 і 20

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 65—70.)

Лічбы "60" і "20" прысутнічалі ў загалоўках усіх маіх папярэдніх нататкаў, надрукаваных пад рубрыкай "З Берлінскага блакнота". Здавалася б, на гэты раз можна і адысці ад іх, даць іншую назву публікацыі. Але я ўсё ж вырашыў нічога не мяняць: лёс галоўнага героя сённяшняга матэрыялу як-ніяк ужо шаснаццаць гадоў звязаны з Германіяй, якая, нагадваю, сёлета адзначае 60-годдзе ФРГ і 20-годдзе падзення Берлінскай сцяны.

«Нашы» ў Германіі



Віктар Кавалёў перад чарговым марафонскім забегам.

У канцы шасцідзесятых гадоў я вучыўся на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Коля Сарока, Міша Буслаўскі, Валера Навумовіч і Віця Кавалёў — на лечфаку Мінскага медінстытута. Тое, што я і яны былі студэнтамі абсалютна розных вышэйшых навучальных устаноў, не толькі не перашкаджала нашаму сяброўству, а, наадварот, з кожным семестрам яно мацнела. Усе выхадныя, усе святы — разам! Пры гэтым як толькі надыходзіла субота — танцы! Прабіцца пабочным да будучых дактароў у той час было неверагодна складана: дружыннікі на чале з аксакалам Ісакам Майсеевічам Нісенбаумам, якога ведалі ва ўсім Савецкім Саюзе, і блізка не падпускалі чужакоў. Але дзякуючы Колю Сароку, які з першага курса быў выдатнікам і камсамольскім актывістам, я ўсё ж атрымаў права наведваць вечары, якія часта праводзіліся ў медінстытуце. У сваю чаргу ўмудраўся праводзіць хлопцаў на танцы ва універсітэт. Разам бывалі, памятаю, у дзяўчат камвольнага камбіната, Інстытута народнай гаспадаркі, заглядвалі ў іншыя месцы. Адным словам, кампанія наша была вясёлая і дружная.

Але студэнцкае жыццё хуткаплыннае. Вось і дыпломы на руках! Хто застаўся ў Мінску, а хто паехаў па накіраванні на перыферыю. Міша Буслаўскі вярнуўся ў родную Вілейку, якую ён так любіў расхвальваць падчас застолля; Віця Кавалёў — у свой слаўны Гомель са знакамітым Палацам Паскевічаў...

У кожнага далейшае жыццё складвалася па-рознаму. Найбольш пакручастым, як мне здаецца, аказалася яно ў Віктара. Хоць напачатку ўсё было так, як ён і планаваў. Вярнуўся дахаты, уладкаваўся доктарам у клініку, ажаніўся з цудоўнай украінскай дзяўчынай, якая бліскуча скончыла Гомельскае музычнае вучылішча; не ўзнікла праблем з кватэрай — бацькі вырашылі пытанне з жыллём у цэнтры горада.

Сямейнае шчасце азмрочыла чарнобыльская трагедыя. Ужо як вопытны доктар Віктар Кавалёў ведаў: з-за злачыннай хлусні мясцовых камаёў і сталічных слюнькоўцаў два сыны-малалеткі хапнулі немалую дозу радыяцыі. Што рабіць? Куды падацца? Не адразу прыйшла думка кінуцца за мяжу. Але ў рэшце рэшт было цвёрда вырашана: ехаць! У якую краіну? Нехта параіў: у Аўстралію. Звярнуліся з просьбай прыняць — адказу не атрымалі. А тут знаёмыя прывезлі з Масквы анкеты нямецкага пасольства. Запоўнілі — і на пошту. Праз кароткі час паведамленне — прыязджайце для субяседавання. Ноч — і ў Маскве. Вярталіся ў Гомель з дазволам на пераезд у Германію.

З 1993 года сям'я майго студэнцкага сябра Віктара Кавалёва жыве ў Берліне. Удакладняю — у заходняй частцы Берліна. Побач з шыкоўным гатэлем "Берлін", што на Лютцаў-пляц, у якім нас, беларускіх журналістаў, пасялілі падчас нядаўняга наведвання Германіі па запрашэнні фонду Конрада Адэнаўэра.

Званок — і чую радасны голас жонкі Віктара. Яго самога на той момант не аказалася дома — быў у Вене, дзе ўдзельнічаў у марафонскім забегу... Чалавеку вось-вось стукне шэсцьдзесят, а ён едзе-ляціць хоць на край свету, каб прабегчы 42 кіламетры 192 метры.

— І калі любімы вернецца? — удакладняю ў Наталлі, якую не бачыў амаль дваццаць гадоў.

— Заўтра, — і тут жа запрашае: — Скажы, калі ў вас там будзе свабодная гадзіна-другая, ён пад'едзе на машыне і забярэ... Вячэраем у нас...

І вось я ўжо ў моцных абдымках Віктара, не, не Віктара, а таго самага Віцькі, з якім у студэнцкія гады шастаў па інтэрнатах, парках, танцпляцоўках...

— Глядзі, не задушы. Бачыш, ад'еўся на нямецкіх харчах...

— Не ад'еўся, а набыў спартыўную форму, — жартуе Віктар. — Ты вось у нямецкіх рэстаранах піва п'еш (*менавіта ў адным з іх у нас быў прыём.* — **Аўт.**), а я бегаю... Наступны марафон — у Лондане.

— Ад старасці ўцякаеш. Дарэчы, адзін мой калега, які заўважыў, што ты праз акно выглядаеш мяне, сказаў: "Нейкі малады чалавек чакае цябе..."

Гляджу на Віктара: ён такі, якім быў два гады таму, калі прыязджаў у Мінск на сустрэчу з аднакурснікамі, — без адзінай маршчынкі, без сівізны, падцягнуты...

Садзімся ў машыну, якая быццам толькі што пакінула канвеер, — і праз некалькі хвілін прыпыняемся ля дома, у якім жыве Віктар. Ён бярэ пульт — і вароты аўтаматычна расчыняюцца. У зялёным двары — разлінееная пляцоўка, на якой мой сябра прыпаркоўвае машыну.

Дом, у якім жыве Віктар, сваім фасадам падобны на той, які стаіць у Мінску на Бранявым завулку і ў якім некалі жылі Мяснікові, Таразевіч, іншыя высокія асобы... Толькі калі я праязджаў міма яго апошні раз, то заўважыў: згубіўся ранейшы шарм. Некалі нельга было свабодна трапіць у двор гэтага элітнага дома — цяпер праход свабодны, вароты — нараспашку, брамка перакошана... А вось да майго сябра Віктара Кавалёва, які цяпер жыве ў заходняй частцы Берліна, абы-хто не заедзе і не зойдзе: двор з усіх бакоў агароджаны, вароты адчыняюцца і зачыняюцца толькі з дапамогай пульта.

Яшчэ хвіліна — і мы на другім паверсе ў трохпакаёвай кватэры. Планіроўка сучасная, усё прадумана...

— І колькі ж вы плаціце за яе ў месяц? — пытаюся ў Віктара і Наташы.

— Ні еўра.

— Як гэта так? — раблю выгляд, што нічога не разумею.

— А вось так. За нас кватэру аплачвае сацыяльная служба. Мы разлічваемся толькі за электрычнасць і тэлефон.

Даведваюся, што па прыездзе ў Германію сям'я Кавалёвых паўгода пражыла ў двухпакаёвым нумары былой гасцініцы спецслужбы "Штазі".

— Там таксама былі нармальныя ўмовы, — гаворыць Віктар. — Але ў немцаў закон: пасля шасці месяцаў ты як беженец маеш права выбраць звычайнае жыллё ў любым раёне. Мы вось выбралі гэтую кватэру.

— І як гэта вам удалося знайсці такую кватэру ў самым цэнтры Берліна?

— Удалося. Пры гэтым ні маркі, ні еўра не патрацілі на яе абуладкаванне, усё за кошт сацыяльнай службы — і мэбля, і шторы, і пральная машына, і пыласос, і нават прас...

— Ты забыў сказаць, што нам яшчэ прапанавалі бясплатна набыць швейную машыну, — падкрэслівае спадарыня Наталля.

— Можа, успомніш і тое, як мы вымяралі, колькі метраў тканіны нам трэба на шторы? — з гумарам заўважае Віктар і расказвае такі эпізод. Прыходзіць работніца з сацыяльнай службы, удакладняе, колькі і чаго трэба на сёе-тое. Потым вырашыла праверыць, ці правільна вылічана, колькі і якіх матэрыялаў пойдзе на вокны. Перамерала і гаворыць: "Вось вам дадатковы чэк на шторы, вы памыліліся на два метры..."

Такая яна, Германія! Калі ўжо прымаюць людзей з іншых краін, то клапоцяцца аб іх па поўнай праграме — каб і дах быў над галавой, і босымі не хадзілі, і галоднымі не былі.

За гутаркай мы забылі нават пра віно. Хочацца пра ўсё распытаць, даведацца, як сапраўды жывецца маім сябрам, якіх лёс выпадкова закінуў у Германію.

— Кватэру вам аплачвае сацыяльная служба, а як з медыцынскай страхоўкай, лекі ж тут дарагія?

— Для нас усё бясплатна.

— Жартуеце, даражэнькія?

— Ніколькі не жартуем, проста тую ж медыцынскую страхоўку за нас аплачвае тая ж сацыяльная служба.

— Можа, яшчэ і на праезд у гарадскім транспарце льготы?

— А як жа!

Калі б субяседнікі не былі даўнішнімі сябрамі, можа, і не лез бы так адкрыта ў душу. А тут, як кажуць, свае, родненькія, і чаму не патузаць іх з усіх бакоў?

— Віктар, як доктар ты набіў руку яшчэ ў Гомелі. Скажы, а чаму па пераездзе ў Германію не замацаваўся ў медыцыне?

— Па-першае, з гэтым тут не ўсё проста. Нават самым актыўным людзям, якія прыязджаюць з Беларусі ці з Расіі, патрабуецца на гэта як мінімум двасры гады. Трэба дасканала авалодаць нямецкай мовай, здаць не адзін экзамен, прайсці шэраг тэстаў, стажыровак... Я спачатку неяк не рызыкнуў, а потым, калі ўзрост падбіраўся да пяцідзесяці, палічыў, што пазнавата...

— А есці ж хочацца і ў пяцьдзесят, і ў шэсцьдзесят, і ў семдзесят, — нягледзячы на начны час, правакую на далейшую шчырасць Віктара і Наталлю.

— А ты што думаеш, мы тут галадаем? Калі харчавацца не ў рэстаранах, а дома, то на месяц з разліку на чалавека хопіць і двухсот еўра. А мне даюць семсот еўра, столькі і Наташы. Сын вучыцца, у яго стыпендыя 550 еўра, — дзеліцца сакрэтамі сямейнага бюджэту Віктар.

— А з вамі раней жыў яшчэ старэйшы сын?..

— Жыў, але цяпер у яго свая сям'я, і яны разам з жонкай і дачкой жывуць у асобнай кватэры.

— Купілі?

— Не, сацыяльная служба прадаставіла, як і ўсё астатняе.

Да глыбокай ночы доўжылася застолле. Не столькі віно смакавалі, колькі стараліся нагаварыцца. Не змаўкалі і тады, калі Віктар пешшу праводзіў мяне ў гатэль. Толькі апынуўшыся ў пакоі, застаўшыся сам-насам, я міжволі падумаў: а за якія такія шышы Германія гарантуе бесклапотнае жыццё такім вось эмігрантам, як сямейства Кавалёвых з Гомеля? Больш як за шаснаццаць гадоў палец аб палец не стукнулі дзеля папаўнення бюджэту нямецкай дзяржавы, а жывуць — дай Бог кожнаму ў нашай краіне. Гартаючы фотаальбом, я звярнуў увагу на здымкі: вось Віктар, Наталля і дзеці на зімовых курортах, а вось — на летніх. Тут на пікніку з сябрамі, а вось гэтыя здымкі зроблены з іншай нагоды, але таксама сведчаць, што Кавалёвы не замыкаюцца ў сценах дыхтоўнай берлінскай кватэры.

Не хвалюе маіх сяброў фінансавы крызіс. Адчуваецца, не хвалюе іх і ўзрост. Калі б жылі ў Гомелі, то сёлета Віктар збіраўся б на пенсію. А тут, у Германіі, чарговы юбілей не абяцае яму ніякіх змен у жыцці. Як атрымліваў дапамогу, так і будзе атрымліваць. Наадварот, калі дасягне пенсіённага ўзросту па нямецкіх мерках, то пэўныя льготы нават пашырацца. Адным словам, будучае жыццё яго бачыцца бязвоблачным.

А што могуць сказаць на гэты конт яго сябры-аднакурснікі? Паколькі, як і Віктара, я ўсіх іх добра ведаю, то хочацца крыху паразважаць, зірнуць на жыццё з мясцовай званіцы.

Віктар дэманструе марафонскія ўзнагароды аўтару нататак.

Дуля ад роднай дзяржавы

Амаль сорак гадоў мінула, а заплюшчу вочы і бачу, як Міша Буслаўскі "банкуе" за сталом з нагоды паспяховага завяршэння чарговай сесіі. Ён выдзяляўся сярод сяброў-аднакурснікаў не толькі тым, што быў на год-два старэйшы за іншых, але і сваёй сялянскай практычнасцю. Ці не з-за гэтага ён і не імкнуўся застацца пасля вучобы ў Мінску. Ведаў, у сталіцы кватэру не хутка атрымаеш, а наконт таго, каб пабудаваць свой дом, — гэта ў той час нават у сне не магло прысніцца.

Праўда, і ў роднай Вілейцы, куды вярнуўся па размеркаванні пасля заканчэння інстытута, манная каша з неба не падала. Ажаніўся і стаў, як кажуць, прымаком — доўгі час жыў у цешчыным доме разам з усім яе сямействам. Не адзін год упіраўся, пакуль пераехаў у свой дом, які пабудаваў па ўласным праекце. Днём за апарацыйным сталом, а да глыбокай ночы — на будоўлі. Адным словам, ніхто не падарыў жыллё, потам і крывёю мазоляў даўся яму кожны квадратны метр.

Ужо некалькі гадоў можна было б адпачываць. Ды дзе там! Зімой толькі за газ трэба плаціць тысяч пад дзвесце, а гэта, лічы, амаль палова пенсіі. А колькі іншых расходаў! Дочкі маюць свае сем'і, а малодшы сын яшчэ вучыцца ў Гродзенскім медінстытуце, трэба ж хлопцу дапамагаць! Таму і не думае Міхаіл Сцяпанавіч Буслаўскі пакідаць работу. Наадварот, баіцца, каб начальства не знайшло замену, вунь колькі пенсіянераў за апошнія гады адпраўлены на адпачынак.

Днямі патэлефанаваў Валерыю Навумовічу. Як і Міхаіл, ён крыху старэйшы за сваіх былых аднакурснікаў — Мікалая Сароку і Віктара Кавалёва. Трыццаць гадоў і два месяцы адпрацаваў анестэзіёлагам-рэаніматарам. Пра такі стаж у той жа Германіі нават марыць не могуць! Праўда, і без такога рэкорднага стажу са звышшкоднымі ўмовамі працы нямецкі калега можа лёгка разлічваць на пенсію як мінімум у тры тысячы еўра. А што паклала наша родная дзяржава Валерыю Трафімавічу? Пад 460 тысяч беларускіх рублёў. Па сённяшнім курсе — недзе сто дваццаць еўра. Жыві і радуйся! Каб звесці канцы з канцамі, у апошнія гады падпрацоўваў на адной фірме. Але яна на мяжы банкруцтва, і вось аказаўся наогул без работы. Добра, калі пашанцуе знайсці іншае месца. А калі не?..

У студзені пенсіянерам стаў і Коля Сарока. Для ўсіх ён ужо даўным-даўно вядомы прафесар, доктар медыцынскіх навук, і не Коля, а Мікалай Фёдаравіч Сарока. Толькі для мяне ён быў і застаўся Колем. Рэдка бывае, каб мы сустрэліся і не ўзгадалі былыя студэнцкія гады. Здаецца, учора гэта было. А ў студзені, як я ўжо заўважыў, і яму, Мікалаю Фёдаравічу, споўнілася шэсцьдзесят.

Хто не ведае яго жыццё, можа падумаць: шчаслівчык! Абараніў спачатку кандыдацкую, потым доктарскую, быў дэканам лечфака, прарэктарам інстытута, выконваў абавязкі рэктара, цяпер вось загадчык кафедры, галоўны рэдактар вядучага медыцынскага часопіса, член розных грамадскіх рад... Сапраўды, шчаслівчык, але які кошт такога шчаслівага жыцця? Абараняць кандыдацкую давялося ў Яраслаўлі, тут, у Мінску, трэба было пакінуць месца для дачкі высокага начальніка. Нямала памыкаўся, пабадзяўся па чужых кутках, пакуль не атрымаў нармальную кватэру. Не, не з інстытуцкага фонду; ад дзяржавы толькі жонцы як участковаму доктару некалі прапанавалі двухпакаёвую "хрушчоўку".

Адным словам, усё жыццё рваўся да нейкіх вышынь, а што зарабіў? Пенсію ў 462 тысячы рублёў. Рана ці позна, але кафедру давядзецца пакінуць, як і рэдакцыйную працу. І як тады можна будзе жыць на нейкія 122 еўра?! Той жа Віктар Кавалёў, які для нямецкай дзяржавы абсалютна нічога не зрабіў, сёння мае 700 еўра. І галава ў яго не баліць, як заплаціць за кватэру. А тут зімой за чатырохпакаёўку набягае разам з тэлефонам, платай за камп'ютэрнае падключэнне, яшчэ за тое-сёе пад 300 тысяч рублёў. Калі, не дай Бог, заўтра застанецца з адной пенсіяй, то кладзі зубы на паліцу. Вядома ж, пра тое, каб купляць новыя кніжкі, бываць на канцэртах, у тэатрах, і марыць не давядзецца.

Адчуваю, мае апаненты звернуць увагу на песімізм, якім афарбаваны нататкі. Маўляў, не трэба так прадстаўляць, што вось у Віктара Кавалёва, які разам з сям'ёй з'ехаў за мяжу, жыццё райскае, а яго беларускія сябры — жабракі. Вядома ж, сёння, калі яшчэ працягваюць працаваць, не жабракі, але што іх чакае наперадзе, калі і цяпер яны не могуць пахваліцца высокім дастаткам, хоць у кожнага за плячыма пад сорак і болей гадоў працоўнага стажу. Так, яны засталіся вернымі сваёй прафесіі, шмат аддалі сіл і здароўя медыцыне. І можна радавацца таму, што змаглі дапамагчы тысячам і тысячам людзей. Але хто ім дапаможа, калі яны застануцца жыць на адну пенсію?

Мае даўнішнія сябры — і Міхаіл Буслаўскі, і Валерый Навумовіч, і Мікалай Сарока — пераступаюць тую мяжу, за якой кожны з іх мае поўнае маральнае і юрыдычнае права разлічваць на дапамогу з боку дзяржавы. Але што гэта за дапамога ў выглядзе 400—460 тысяч рублёў? Здзекі ды і толькі! Людзі аддалі дзяржаве ўсё, а ім — костка пад ногі. Што цікава: Віктар Кавалёў, які эмігрыраваў у Германію, таксама мае права на пенсію ў Беларусі. Па-першае, ён дагэтуль захаваў наша грамадзянства, а па-другое, калі прыплюсаваць час вучобы ў інстытуце, то ў яго дастатковы стаж. Але навошта яму беларуская пенсія ў 110—120 еўра, калі Германія плаціць штомесяц 700 еўра, не патрабуючы ні аднаго еўра за жыллё, лекі, медыцынскае абслугоўванне?

Не буду дражніць гусей, досыць разваг. Абавязак журналіста — даць інфармацыю. І, мне здаецца, я яе даў.

Чытайце, разважайце, абмяркоўвайце. А я на гэтым у сваім "берлінскім блакноце" стаўлю кропку.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ.

Мінск—Берлін—Патсдам—Мінск.

МНЕНИЕ

Валдас АДАМКУС, президент Литвы: «Не победа над насилием, а лишь смена насильника»

Как сообщает **Delfi**, по словам президента Литвы **Валдаса Адамкуса**, окончание Второй мировой войны для Литвы "символизирует боль". Об этом глава Литвы заявил 8 мая на Европейском съезде редакторов культурных изданий в Вильнюсе. *"8 мая 1945 года для Литвы, как и многих стран Восточной Европы, означает не победу над насилием, а лишь смену насильника. В то же время история для Литвы еще раз превратилась в служанку политики и идеологии, прикрывающую несправедливость и преступления, искажающую факты, клевещущую на свободу и ее защитников"*, — заявил президент.

Курс на ЕС

Новое правительство Исландии во главе с Йоханой Сигурдардоттир приняло решение как можно быстрее начать процесс присоединения страны к Евросоюзу. В ближайшие дни проект резолюции на этот счет будет передан в парламент, а окончательное решение будет принято на всенародном референдуме.

Новый рекорд пения

Книга рекордов Гиннесса зафиксировала новый рекорд пения хором, после того как 160 тысяч человек спели в Индии, передает агентство IANS.

Предыдущий рекорд пения хором был зарегистрирован в 1937 году в Германии, где 60 тысяч немцев исполнили национальный гимн.

Десятки тысяч индийцев, которые собрались в пригороде столицы штата Андхра-Прадеш города Хайдерабад, исполнили семь песен на слова средневекового поэта Аннамачарьи во славу индуистского бога Вишну. Организаторами рекордного мероприятия выступили власти штата.

Крупнейший выигрыш

Обладатель билета лотереи EuroMillions в Испании выиграл рекордную сумму в 110 миллионов фунтов стерлингов (более 160 миллионов долларов), сообщил британский телеканал Sky News.

Это крупнейший выигрыш в мировой истории лотереи. Предыдущий рекорд был установлен в прошлом году во время розыгрыша итальянской лотереи Superenalotto, тогда один человек выиграл 81 миллион фунтов стерлингов.

Берлин и Париж — одним голосом

Канцлер Германии Ангела Меркель и президент Франции Николя Саркози в воскресенье вновь выступили против расширения Евросоюза, в частности, за счет Турции, передает агентство DPA.

Выступая перед активистами молодежного отделения Христианско-демократического союза (ХДС) в Берлине, Меркель отметила, что нет смысла постоянно расширять ЕС, если такой рост не позволит союзу нормально функционировать. По ее мнению, Турции следует предложить привилегированное партнерство с Евросоюзом, но не полноценное членство в альянсе.

В свою очередь Саркози заявил газете Bild am Sonntag, что "нам нужна хорошо организованная Европа". "Это означает, что мы не можем расширяться безгранично. Мы не должны давать пустых обещаний Турции", — пояснил французский лидер.

В качестве альтернативы Саркози предложил создать с Турцией объединенную экономическую зону. Он добавил, что такой же подход может способствовать сближению Евросоюза и России.

ТЕМА ДНЯ

Робкое сближение под бдительным оком Москвы

На днях запущен проект "Восточное партнерство": ЕС решил укрепить связи с шестью восточными соседями. СМИ отмечают противоречивость этой европейской инициативы, ее слабые стороны и неясные перспективы.

ЕС робко укрепляет связи с шестью восточными соседями "под невидимым и угрожающим оком бывшего опекуна", пишет корреспондент **Le Figaro** Пьер Авриль. Намереваясь инвестировать до 2013 года 600 млн евро в экономики этих стран, Европа стремится достичь стабильности на своих восточных границах. Странам, в различной степени пострадавшим от экономического кризиса и хронической политической нестабильности, будут даны торговые возможности и в обмен на структурные реформы, призванные побороть коррупцию и привить демократические стандарты.

Daily Telegraph пишет, что прошедший в Праге саммит ЕС с шестью бывшими советскими республиками значительно ослабил свой пафос и существенно снизил предполагавшийся ранее настрой на "Восточное партнерство". Причина, по мнению газеты, — внутренний раскол в Евросоюзе и страхи, особенно в Германии, того, что ускоренная интеграция с Восточной Европой приведет к резкому увеличению иммиграции их граждан в страны ЕС. По этой причине государства ЕС отказались от политики упрощения визового режима с этими странами.

Frankfurter Allgemeine не видит принципиальных новшеств в программе "Восточное партнерство": Ничего особо нового в этой программе нет. В принципе, речь идет о европейской политике соседства, разработанной сразу после волны расширения ЕС в 2004 году и поданной в новой упаковке. Россия, с которой ЕС поддерживает особые отношения, охотно именующиеся "стратегическими", не участвует в новой программе. Зато в числе участников сразу три кавказских государства, которые не граничат с Евросоюзом, но играют не последнюю роль в снабжении Европы энергоресурсами.

The Wall Street Journal пишет, что план "Восточное партнерство" обострил отношения между ЕС и Россией, полагающей, что Брюссель вмешивается в ее сферу влияния. Европейская сторона в свою очередь пытается избежать повторения грузинского и газового кризисов.

По мнению **Die Welt**, Россия воспринимает новую "восточную политику" ЕС как провокацию. Отношения России с НАТО и ЕС напряжены до предела. В то время как на них не могли не сказаться высылки дипломатов, военные учения в Грузии, Брюссель еще и закрепил печатью партнерство с 6 бывшими советскими республиками. Более неблагоприятного фона для создания "Восточного партнерства" трудно себе представить.

Однако, как полагают эксперты, сомнения в подлинной серьезности намерений ЕС вызывает бюджет программы — 600 млн евро, часть которого будут составлять средства из уже существующих проектов. Кроме того, добавляют авторы материала, 6 партнеров представляют собой весьма разнородную группу: Молдова и Беларусь однозначно находятся под влиянием Москвы. Украина разочарована тем, что значимость нового предложения ниже по сравнению с уже существующими договоренностями с Брюсселем. Армения и Азербайджан, продолжают журналисты, не столь заинтересованы в политических аспектах партнерства — им важнее позиционировать себя в Европе как поставщиков энергоресурсов.

Россия, по всей видимости, боится, что Брюссель может поставить 6 своих новых партнеров перед выбором: мы или Москва? Премьер Путин назвал "Восточное партнерство" альтернативой расширению НАТО на Восток. При этом, по словам аналитика по Восточной Европе из Фонда имени Бертельсманна Корнелиуса Охманна, Москва считает законными свои притязания на влияние в соседних государствах.

Подготовил к печати Василий КРАВЧУК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
12—14 МАЯ 2009 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Эдмінас БАГДОНАС: «Усходняе партнёрства» выгадна найперш Беларусі»

Напярэдадні дня Перамогі супрацоўнікі Пасольства Літвы ў Беларусі на чале з паслом Эдмінасам Багдонасам традыцыйна ўсклалі кветкі ў Хатыні ў памяць ахвяр Другой сусветнай вайны.

Пасля ўскладання кветак спадар Багдонас адказаў на пытанні журналістаў, якія найперш папрасілі пракаментаваць уступленне Беларусі ва "Усходняе партнёрства".

— Мы ўвесь час сцвярджалі, што менавіта гэты шлях для Беларусі не толькі правільны, але і выгадны, — сказаў Эдмінас Багдонас. — Удзел ва "Усходнім партнёрстве" дазволіць краіне рэалізаваць новыя ініцыятывы ў вырашэнні энергетычных, інфраструктурных, візавых і іншых пытанняў. Самае галоўнае, што Беларусь прыняла гэтую прапанову. Цяпер важна, як дэкларацыя будзе ўвасабляцца ў жыццё, якія пэўныя захады будуць зроблены па яе выкананні.

— А што вы скажаце з нагоды таго, што візавае пытанне адклалі на трэцяе месца?

— Віза — гэта тэхнічнае пытанне. Калі Беларусь і Еўрасаюз знойдуць варыянты ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, то рашэнне па ім можа быць прынята вельмі хутка. А ўвогуле, удзел Беларусі ва Усходнім партнёрстве адпавядае зацікаўленасці Літвы ў стабільным рэгіёне і стабільнай сітуацыі ў энергетычнай сістэме.

Алесь СІВЫ, фота аўтара.

РЭХА

Прыклад, як ставіцца да сябе самога

Нядаўна нацыянальна свядомая грамадскасць нашай краіны віншавала і ўшаноўвала з нагоды 80-годдзя выдатнага сына Беларусі, доктара гістарычных навук прафесара Леаніда Лыча. Ён не толькі прызнаны навукоўца, а і сапраўды вялікі патрыёт, узор мудрасці, інтэлігентнасці. Паважаны спадар Лыч — гэта прыклад для ўсіх нас, беларусаў, як патрэбна кожнаму з нас у першую чаргу ставіцца да самога сябе, як быць проста нармальным чалавекам у любых варунках, я ўжо не кажу пра нейкія высокія матэрыі. У сваёй працы "Ратуйцеся, беларусы!" навуковец выказвае погляд на тое, што неабходна кожнаму з нас рабіць, каб уратавацца, не знікнуць бясследна ў бездані цемрашальства. Як не прыслухацца да парад мудраца сучаснасці?

Але, як бачым на прыкладзе розгаласу на публікацыю прафесара, сучасныя цемрашалы літаральна ашчэрыліся сваёй нянавісцю да беларускага слова — падмурка і стрыжня жыцця кожнай нацыі. Побач з артыкулам "Ратуйцеся, беларусы!" юрыст Аляксандр Студзянцоў бессаромна піша сваё "рэзюмэ" пра мову, якую не ведае. Чамусьці не жадаюць карыстацца роднай мовай у сваіх публікацыях і многія дэмакратычна настроеныя аўтары, у тым ліку вядомыя грамадскія дзеячы... Вольга Грэйгъ называе сябе "беларускай" пісьменніцай, сцвярджаючы: "Мои книги предполагают наличие ума у читателей". А вось "наличие" ведання дзяржаўнай мовы не лічыць для сябе абавязковым...

Не буду пералічваць усіх, хто вольна ці міжволі падыгрывае русіфікатарам краіны. Рэферэндум 1995 года — шлях да генацыду беларускай нацыі. Таму тым, хто адмаўляе роднаму слову ў праве на шырокае ўжыванне, раю ўчытацца ў словы Якуба Коласа з яго перадсмяротнага ліста ў ЦК КПБ: *"Пратэставаць супраць роднай мовы, з аднаго боку, могуць людзі па неразуменні, а з другога — нашы ворагі..."* Няхай тыя, хто не чуе ні Якуба Коласа, ні Францішка Багушэвіча, ні Леаніда Лыча, самі сабе адкажуць на пытанне — хто ж яны такія?

Ніколі не верце любому, хто лічыць сябе грамадзянінам Беларусі, але размаўляе на чужой мове, бо ён не паважае, не цэніць сваё роднае, незаменнае.

Яшчэ раз праз "Народную Волю" хачу шчыра падзякаваць шаноўнаму настаўніку сучасных беларусаў спадару Леаніду Лычу і пажадаць яму яшчэ шмат дзесяцігоддзяў вучыць нас МУДРАСЦІ. Паважаныя суайчыннікі, калі мы прыслухаемся да яе, дык выжывем, а калі спакусімся на прыгожыя абяцанкі манкуртаў, то згінем. Нас з усіх сіл, так бы мовіць, выцягваюць зársткі, а мы ўпіраемся. Дзе ж інстынкт самазахавання? Ён існуе нават у аднаклетачных, а мы ж, здаецца, яшчэ быццам людзі. Ці ўжо не?

З павагай —

Мікола КАНАХОВІЧ, афіцэр у адстаўцы.

г.Пружаны.

ЮБИЛЕЙ

Николай ХВИСЮК:

«Немцы аплодировали нам стоя!»

В этом году народному хору ветеранов "Спадчына" исполняется 50 лет. В честь юбилея "Народная Воля" встретилась с руководителем хора Николаем Хвисюком.

— Кто поет в хоре ветеранов "Спадчына" — люди, давно мечтавшие о музыке, но получившие возможность лишь на пенсии заниматься ею, или профессиональные музыканты?

— Наши исполнители не профессионалы — просто к пенсии они отнянчили детей, разобрались с внуками, а потребность в активности осталась. Например, женщине, которая пришла к нам два месяца назад, после выхода на пенсию сыновья заявили: "Ты свое отработала, теперь делай что хочешь, но работать мы тебе не дадим!" Что же делать человеку, который всю жизнь был занят, постоянно где-то нужен? Чтобы реализовать свою потребность в активности, такие люди идут к нам. Другое дело, что мы не всех принимаем...

— Кого же и по каким признакам берете?

— Для начала я проверяю, есть ли у человека слух и более-менее приличный голос. Затем сажаю его в подходящую хоровую партию и даю время освоиться, побороть стеснение. Это могут быть и пару месяцев, и полгода. За это время он узнает коллектив, а мы — его: что за человек, как он относится к нашим порядкам. Затем я вызываю его к себе и после разговора принимаю решение. Бывает, и отказываю некоторым.

— Если я не ошибаюсь, большинство участников вашего хора — женщины. Это связано с тем, что у дам большая тяга к прекрасному в виде музыки?

— Сейчас у нас на 35 женщин приходится 5 мужчин. Конечно, мужчин изначально приходит меньше, но порой они приживаются лучше женщин. Например, пришла к нам одна пара: женщине так понравилось наше выступление, что она решила и себя попробовать, а муж пошел за компанию. И что бы вы думали произошло через месяц? Мужу так понравилось это занятие, что он заявил жене: "Ты как хочешь, а я буду ходить на хор в любом случае!"

— Государственный академический народный хор Республики Беларусь имени Геннадия Цитовича постоянно выезжает с выступлениями в Европу. А у вас зарубежные гастроли случаются?

— Не сыпьте соль на рану! Конечно, хотелось бы поехать куда-нибудь. Но кроме поездки в Германию, которую нам организовало общество "Минск—Майнц" в 1999 году, мы никуда не ездили. Это был просто праздник для нас — мы прекрасно провели время. А на приеме после нашего выступления бургомистр Майнца заявил, что будет голосовать за принятие Беларуси в Евросоюз. Потому что так хорошо петь такие замечательные песни плохой народ не может!

Но даже 10 лет назад, когда немцы нам все оплачивали, одна наша исполнительница отказалась поехать, потому что у нее не было денег. Конечно, проезд, проживание и питание были бесплатны, но человеку же надо хоть открытку оттуда привезти. Однако и на это денег нет.

Конечно, Национальный хор имеет спонсоров, которых у нас нет. Мы даже по Беларуси не можем особо разъездиться...

— А если попробовать найти спонсоров?

— Мы же все никак не можем дождаться закона о спонсорстве, по которому если предприниматель оказывает кому-то помощь, то на эту сумму освобождается от налогов. Иначе, кому это надо — помогать тебе, а потом с этой суммы еще и платить налог государству?

— Существует популярное заблуждение, что красивый звонкий молодой голос может принадлежать лишь молодой красивой девушке...

— Нас действительно встречают по одежке: смотрят — приехали какие-то старики. А после концерта подходят и говорят: "Какие же вы молодые! Как же вы хорошо поете!"

Когда мы выступали в концертном зале немецкого города Майнца, организаторы поставили специально для нас на сцене стулья. Они думали, что мы споем одну песню и повалимся. А когда мы выдали им часовую программу, не садясь, люди аплодировали стоя! (*Смеется.*)

— Вы и во внесценической жизни являетесь одной командой?

— Конечно! У нас семейная атмосфера. Вместе летом выезжаем на пикники, вместе навещаем заболевших, вместе отмечаем праздники. Прямо в нашем репетиционном зале собираемся — тут у нас и песни, и пляски случаются. Мы же нормальные люди, а нормальный человек не может не выпить по поводу (*смеется*).

— Семьи участников хора не ревнуют?

— Случается (*смеется*)! У нас ведь на моей памяти в хоре соединились две пары. Бывает и другая ревность: собирается жена на репетицию, а муж ей заявляет: "Как на дачу ехать, так у тебя все болит, а как на хор, так летишь!" Но когда мужья приходят на наши репетиции, сабантуи, то видят, какая у нас хорошая атмосфера, и все вопросы отпадают.

— Кроме того, что вы руководитель хора, также вы являетесь доцентом кафедры хорового дирижирования Белорусской государственной академии музыки. А члены вашей семьи тоже связаны с музыкой?

— Жена у меня концертмейстер-пианист, она работает со мной и на кафедре, и в хоре. А вот дети свою жизнь с музыкой не связали. В свое время чисто из меркантильных соображений хотел, чтобы дочь стала пианисткой. Она училась на педагога по дошкольному воспитанию. Я советовал ей освоить фортепиано и пойти преподавать пение — просто чтобы дети были при ней, досмотрены и ухожены. Но она лишь три года позанималась и сказала, что это не ее. Я не настаивал — и правильно сделал: сейчас она занимается бизнесом, и фортепиано ей пригодилось лишь для общего образования.

Ольга ПРУДНИКОВА.

СПРАВКА «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

Хор ветеранов "Спадчына" появился в 1959 году в стенах Республиканского Дворца культуры профсоюзов. Тогда он назывался Народным хором ветеранов войны и труда.

В 1977 году хору было присвоено почетное звание "Народный коллектив".

С 1982 года хоровой коллектив возглавляет доцент кафедры хорового дирижирования Белорусской государственной академии музыки Николай Хвисюк. Почти все песни, исполняемые хором сегодня, — в его переложениях.

В копилке наград Николая Николаевича медаль Министерства культуры СССР "За достижения в самодеятельном художественном творчестве", почетный знак Министерства культуры Беларуси "За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры", ряд почетных грамот Белсовпрофа и др.

В 2002 году хор "Спадчына" стал членом коллектива Республиканского Дворца культуры ветеранов.

ПАРАЛЕЛІ

У ЗША самыя высокія заробкі — у дактароў

Дактары ўзначалілі штогадовы рэйтынг часопіса Forbes сярод самых высокааплатных прафесій у ЗША.

Самы высокі сярэднегадавы заробак у ЗША — у хірурга ($206 770).

Медыцынскія работнікі занялі першыя 15 месцаў у рэйтынгу. Сярод іншых высокааплатных прафесій — топ-менеджэр, адвакат, пілот, авіядыспетчар, нафтавік і фінансавы аналітык, паведамляе Газета.ру.

Як паведамляе nn.by са спасылкай на Нацыянальны статыстычны камітэт, сярэдні месячны заробак дактароў у Беларусі складае 1 мільён 243,2 тысячы рублёў (444 долары), сярэдняга медыцынскага персаналу — 689,3 тысячы (246 долараў), малодшага медыцынскага персаналу — 427,3 тысячы рублёў (169 долараў).

А сярэдні заробак ва ўстановах аховы здароўя складаў у лютым 712,5 тысячы рублёў (254 долары).

«ЕВРОВИДЕНИЕ»

Один звонок — тысяча рублей

Свой голос за понравившегося исполнителя телезрители могут отдать сегодня в первом полуфинале и 16 мая в финале.

Телефонные номера для голосования сообщат во время прямой трансляции конкурса. Стоимость звонка с домашнего телефона — 1 тыс.рублей.

С юридических лиц и индивидуальных предпринимателей дополнительно взимается НДС в размере 18% , пишет БЕЛТА.

Продолжительность телеголосования будет 15 минут.

Напомним, первый полуфинал "Евровидения" пройдет 12 мая, 14-го — второй. Финал конкурса пройдет 16 мая. Всего в "Евровидении" примут участие представители 42 стран.

АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ АПОВЕСЦЬ

Васіль ШАРАНГОВІЧ

ГЕН ЖЫЦЦЯ



(Працяг. Пачатак у №№57—70.)

У 1955 годзе мы атрымоўвалі на першым курсе стыпендыю 140 рублёў (па тых грашах да хрушчоўскай дэнамінацыі). За кватэру я спачатку плаціў 90 рублёў, М. Сабадаш браў танней — 80 рублёў. На пражыццё заставалася каля 60 рублёў. Гэта ў тыя часы, калі вялікі батон каштаваў 3 рублі, конская каўбаса (а яна тады прадавалася) каштавала 9—10 рублёў, хлеб 1 рубель 50 капеек. За ўсе гады вучобы я ніколі не атрымліваў ад бацькоў паштовага пераводу, уся дапамога — кавалак сала, зімой яшчэ колца каўбасы, трохі масла, яек, вось і ўсё. Бывала, бацька прыязджаў у Мінск, каб на Юбілейным кірмашы (тады такі быў) прадаць мяса авечкі. У такія прыезды і мне тое-сёе перападала. Зімой, пасля канікулаў, вёз на пражыццё другога семестра сала, каўбасу, нават бульбу і вельмі эканомна гэта расходаваў, бо стыпендыі хапала толькі трохі на хлеб ды на фарбы.

Жывучы ў М. Сабадаша, я захоўваў свой скарб у скрыначцы, у дваровым гаспадарчым сарайчыку. Такія сарайчыкі тады будавалі для тых, хто пражываў у дзяржаўных дамах, іх і цяпер яшчэ можна сустрэць.

Аднойчы, вярнуўшыся з вучылішча, я пайшоў у сарайчык, каб адрэзаць кавалачак сала і зварыць нейкі суп, бо суп усе гады вучобы быў адзіным уратаваннем ад голаду. І бачу — замок не ўзламаны, а маю скрыначку як карова языком злізала. Гаспадар і яго жонка сказалі, што нічога не ведаюць. А для мяне гэта было амаль што галодная смерць. Толькі намнога пазней я даведаўся ад Шуры Шатэрніка, што маім салам і каўбасой закусіў Сабадаш са сваімі сябрамі перад Першамаем. Тады ў мяне і думкі такой не магло ўзнікнуць, бо ён жа быў "честью и совестью" эпохі.

Можна папытацца, а пры чым тут Шура Шатэрнік.

У тым самым пад'ездзе, дзе я кватараваў, жыў на другім паверсе хлапчук, які аднойчы паказаў мне свае малюнкі, сказаўшы, што таксама хоча стаць мастаком. Я зацікавіўся і стаў яго кансультаваць, заахвочваць і падтрымліваць у яго памкненнях. Цяпер Алесь Шатэрнік — знакаміты скульптар, а я лічу, што мая педагагічная практыка, хаця і ўмоўна, пачалася менавіта з яго.

Тэрмінова напісаў бацькам пра такое прыкрае здарэнне. Маўляў, доўга не пратрымаюся, хоць чым-небудзь дапамажыце. Гэта быў першы і апошні раз, калі я звяртаўся да бацькоў па дапамогу, ведаючы, як цяжка ім жывецца, а на руках яшчэ трое дзяцей. К гэтаму часу нарадзіўся мой другі брат, Косця.

Бацька зарэзаў авечку і перад Першамаем прыехаў прадаць яе на тым жа Юбілейным кірмашы. Прывёз тое-сёе з харчу, прадаўшы мяса, даў трохі грошай, застаўся ў Мінску на свята, і мы з ім змаглі схадзіць на святочную дэманстрацыю. Так я дажыў да заканчэння першага курса і адначасова дзесяці класаў. Як-ніяк, а маральнае і фізічнае напружанне было вялікім пры такім напаўгалодным жыцці. Часам ішоў па вуліцы, а ў вачах цямнела, і я мог, самлеўшы, упасці. Калі побач былі людзі, мяне падымалі і вялі да бліжэйшай лаўкі, можа, думалі, што перабраў хлопец. А калі нікога блізка не было, праз некаторы час прыходзіў у прытомнасць і сам шукаў, дзе прысесці, каб ачухацца. Балюча ўспамінаць той час, усё здаецца сном, які заўсёды праходзіць і становіцца прывідам.

* * *

Першы курс закончыў добра, многаму навучыўся, многае ўбачыў, пазнаў, пераасэнсаваў. Убачыў кнігі па мастацтву, хоць можна ўявіць сёння ўзровень друку, ды і выбар кніг пяцідзесятых гадоў. Дзесяць класаў скончыў на "выдатна", на выпускных экзаменах яшчэ мусіў па просьбе настаўнікаў па матэматыцы рашаць варыянты задач для ўсіх радоў, а іх было шэсць. Заданні выдаваліся для кожнага рада асобна, і, як помню, я ледзь паспеў напісаць сваё. І ў вячэрняй школе настаўніца матэматыкі, як і Валянціна Іванаўна ў Мядзельскай, стала ўгаворваць кінуць вучылішча і ісці на фізмат, дзе я мог бы дабіцца многага. Пра гэта я і слухаць не хацеў, мара была адна-адзіная — стаць мастаком.

Наступілі доўгачаканыя канікулы. Горад для мяне як быў чужым, так і застаўся. А тут два месяцы з гакам быць сярод сваіх, хадзіць на танцы, сустракацца з аднакласнікамі і аднагодкамі. Атрымаў стыпендыю за лета, накупіў поўны чамадан чорнага і белага хлеба і, забраўшы з кватэры неабходныя рэчы, прыехаў у Мядзел. Быў прыгожы летні дзень. Перш-наперш наведаў Генадзя Астроўскага. Данесці чамадан з хлебам і свае рэчы да Качаноў я не змог бы. Так было заўсёды, шукаў спадарожную падводу, бывала, начаваў дзеля гэтага ў Мядзеле. А тут Генадзь Ігнатавіч мне паведамляе, што ён навучыўся ездзіць на машыне і атрымаў вадзіцельскія правы. Машыны, зразумела, ён не меў. Але ў двары раённай бальніцы стаяла дабітая "палундра". Кабіна без шкла, няма задняга борта, матор не закрываўся, але быў спраўны. Астроўскі часцяком самавольна браў машыну, каб пакатацца, падраджаючыся заадно падвезці каму сена, каму дровы і г.д. Раённая міліцыя пра гэта ведала, але глядзела скрозь пальцы.

Дык вось, Генадзь Ігнатавіч мне і кажа:

— Давай пойдзем у бальніцу, я папрашу галоўнага ўрача, каб дазволіў цябе адвезці на гэтай машыне дадому. А заадно падвязём бацьку сена.

Рушылі да бальніцы, ён зайшоў да галоўнага ўрача, атрымаў дазвол, і мы пакрочылі да машыны. На ёй не было нумароў, гэта ламачына наогул не была зарэгістраваная. Спроба завесці аказалася няўдалай, хоць бензін і быў. Астроўскі выявіў, што нехта ўкраў бегунок ад запальвання.

Дасціпны і вынаходлівы Генадзь Астроўскі нікольκі не засмуціўся, а прапанаваў пайсці на пілараму, бо там ёсць такая самая "палундра", і на хаду. Дарэчы сказаць, была якраз нядзеля. Ён мне кажа:

— Ты будзеш зубы загаворваць дзяжурнай бабцы, а я сцягну бегунок.

Гэтыя машыны ніяк не замыкаліся, на маторах збоку былі як бы жалезныя жалюзі на зашчэпках. Аперацыя прайшла ўдала, і мы пашыбавалі да "нашай" машыны. Астроўскі яе завёў, мы закінулі ў кузаў мае рэчы і паехалі праз Мядзел у бок Качаноў, па дарозе даліўшы вады ў радыятар.

Праз кіламетр вёска Навасёлкі. Узабраўшыся ў пачатку вёскі на невялікі пагорак, адразу за скрыжаваннем машына заглухла. Пад той час пракладвалі прамы шлях на Кабыльнік, а аб'язной служыла дарога праз Навасёлкі, дзе на скрыжаванні быў паварот налева. Чаму я пра гэта так падрабязна распавядаю, даведаецеся пазней.

Машына стала, а інструменту, само сабой, ніякага. Генадзь Астроўскі пабег па бліжэйшых хатах. Я стаю каля машыны. І раптам едзе міліцэйскі "газік", які накіраваўся ў бок Кабыльніка. За паваротам прыпыняецца, з яго выходзіць капітан міліцыі і шыбуе да нашай "палундры". Я страшэнна перапужаўся. Капітан, убачыўшы сярод вуліцы машыну без нумароў, падазронага выгляду, пытаецца ў мяне:

— А дзе шафёр і чыя гэта машына?

Я адказваю, што нічога не ведаю. Скумекаў-такі! Але ў гэты момант вяртаецца Г. Астроўскі, і капітан задае яму тое самае пытанне. Генадзь Ігнатавіч, не маргнуўшы вокам, кажа, што ён выпадковы тут чалавек і нічога не ведае. Капітан паклікаў свайго шафёра і загадаў яму ўзяць такую дэталь з машыны, каб яна не змагла далей паехаць. І трэба ж! Шафёр вымае той бегунок, які мы сцягнулі на пiлараме. Адыходзячы, капітан гаворыць Г. Астроўскаму, каб той перадаў шафёру, што ён будзе ехаць назад праз гадзіну, дык няхай шафёр яго чакае. Сеў і паехаў. Нямая паўза. Аказваецца, Г. Астроўскі яго пазнаў, гэта быў начальнік Маладзечанскай ДАІ.

Трэба ведаць Генадзя Астроўскага, які ні ў якіх сітуацыях не губляўся. Ён мне гаворыць:

— У нас гадзіна часу. Бяжым у Мядзел, я папрашу ў знаёмага міліцэйскага шафёра бегунок ад "казла", які падыходзіць да "нашай" "палундры".

Мы сапраўды пабеглі, бо надта ж мала было часу. Генадзь Ігнатавіч выпрасіў бегунок, і мы кінуліся назад. Ён нешта круціў, шрубаваў у машыне, і раптам яна завялася! Аддаўшы інструменты іх гаспадарам, мы рванулі на Качаны. Дадам, падчас рамонту маёй задачай было ўважліва сачыць за дарогай, якая добра праглядалася з пагорка за Навасёлкамі. Мы дамовіліся: калі пакажацца міліцэйская машына, сваю "палундру" кідаем і з маімі трантамі ўцякаем. Але ўсё абышлося, мы паспелі і толькі вечарам, калі было ўжо цемнавата, з'явіліся ў Качанах. Скажу, што машына раўла мацней за трактар, бо выхлапной трубы не было. Дома ад такога грукату перапужаліся, калі мы заехалі ў двары шча.

Павячэралі, а на раніцу паехалі па сена. Машыну трэсла і калаціла, яна часта глухла, але сена звезлі, заадно прывезлі і дроў. Генадзя Ігнатавіча мы з бацькам правялі да Заняў, дзе бацька выпрасіў вядро бензіну, машыну дазаправілі, і, развітаўшыся, Генадзь Ігнатавіч паехаў у Мядзел.

Потым ён расказваў, што не паспеў паставіць машыну ў двор бальніцы, як да яго пад'ехаў на матацыкле мясцовы начальнік дарожнай службы, добра яму знаёмы, і папытаўся, ці не ён учора браў гэтую машыну, бо абласны начальнік загадаў яму знайсці таго, хто на ёй ездзіў. Генадзь Астроўскі, зноў жа не маргнуўшы вокам, адказвае: маўляў, учора быў у Качанах. Сказаў як бы праўду і ў той жа час зманіў. Інспектар папрасіў дапамогі адшукаць таго хулігана, і Генадзь Ігнатавіч гэта яму паабяцаў. На тым усё і скончылася.

* * *

Лета, касьба. Я яшчэ малым хлапчуком доўга вучыўся касіць. Бацька для гэтага знайшоў маленькую шасціручную, яшчэ польскую, коску і прыладзіў пад мой рост. Колькі разоў я рэзаў сабе рукі, каб навучыцца яе вастрыць! Але касец з мяне ўрэшце атрымаўся добры, і я заўсёды стаяў першым у пакосе. Мне вельмі падабалася гэта праца, і я ахвотна ішоў у пакос, хоць і працаваў практычна задарма.

Касьба, хоць гэта і цяжкая праца, для мяне была як песня. Можна ўявіць сабе квяцісты луг, дзень толькі пачынаецца, над галавой ужо пяюць жаўрукі, устае сонца і памалу падымаецца ўгору. На кветках і траўцы блішчыць раса, бы тыя пацеркі. Чым вышэй падымаецца і прыгравае сонца, пачынаюць лётаць матылькі, гудзець чмялі і пчолкі, а ты ідзеш у роўным пакосе, трава і кветкі схіляюць свае галовы, падрэзаныя знізу, і кладуцца адна да адной. За табой роўны, як бы паголены, скошаны луг і толькі дзве нітачкі-сцяжынкі — сляды ад ног. З аднаго боку, шкада зрэзаных кветак, а з другога — душа радуецца ад відовішча сенажаці, падобнай на старонку сшытка ў роўную лінейку. Пра такі гладка скошаны луг качаноўскі Тупік гаварыў: "Во скасіў, блыху можна пасадзіць — і будзе відно". Але сам ён так не ўмеў, і касмылёў няскошанай травы за ім было дужа многа. Як сонца падымалася высока, касцы ішлі дахаты, бо нездарма ж існавала прымаўка: "Раса далоў, каса дамоў".

Касьба патрабавала добра накляпанай касы, ды і ўменне яе вастрыць. Спачатку касу мне кляпаў бацька, але хутка я і сам навучыўся адцягнуць, што значыць адкляпаць, касу не горш за бацьку. Калі я касіў адзін, то мог за дзень злажыць 70 сотак лугу. Хоць быў і хударлявы, але цяглы. Вечарам брыгадзір, замераўшы скошанае, дзівіўся на мой спрыт і запісваў 4,7 працадня, што азначала — мой заробак складаў за такую напружаную працу недзе каля аднаго рубля.

Яшчэ любіў быць у кузні і дапамагаць бацьку. Дапамагаць даводзілася з маленства, і, дзякуючы гэтаму, я многаму навучыўся, што ў жыцці потым вельмі спатрэбілася.

Так паціху міналі канікулы — за гаспадарчай працай, за замалёўкамі з натуры, за акварэльнымі эцюдамі. Перакур пры касьбе або ўборцы сена — я дастаю альбом і стараюся намаляваць сваіх аднавяскоўцаў. І так паўтаралася потым кожнае лета: за паўсядзённай працай, але не прамінаючы ніводных танцаў у акрузе, тым больш што дзецюком я ўжо быў "знатным".

Не агледзішся, як лета ўжо скончылася, час збірацца ў Мінск, трэба зноў уладкоўвацца на кватэру. Студэнты практычна кожны год мянялі кватэры, бо калі хочаш заставацца на той самай, плаці за лета. Таму звычайна мы недзе пакідалі свае пажыткі і наступнай восенню шукалі кватэру зноў. А за летнюю стыпендыю можна было нешта купіць, нейкую адзежу альбо абутак. І так з году ў год. Гэта, вядома, тычылася такіх галадранцаў, як я. Але такіх было не так багата.

* * *

На другі год я ўладкаваўся жыць на Першым Цвёрдым завулку, разам з Васілём Ціханенкам і хлопцамі з Гродна і Добруша. Прозвішчаў іх не памятаю, бо яны былі са старэйшых курсаў, ды і па жыцці я іх больш ніколі не сустракаў і не чуў аб іх потым. Дарэчы, гэта ж можна сказаць і пра большасць тых, з кім вучыўся на адным курсе.

Дык што ж гэта было за "жылое" памяшканне, дзе мы месціліся? Нешта накшталт мансарды, дашчанай, няўцепленай. Мы называлі свой пакой "галубятняй". Уваход быў па лесвіцы з кухні гаспадароў, дзе пасярэдзіне стаяла чыгунная труба ад печкі на першым паверсе.

(Працяг на 6-й стар.)

ГЕН ЖЫЦЦЯ

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

Семестравы прагляд работ у мастацкім вучылішчы. 1958 г.

Як палілася ў печцы, труба моцна награвалася, і трэба было праяўляць асцярожнасць, каб не апячыся аб яе. У нашым пакоі ставілася горача, можна было хадзіць у адной кашулі, але хутка труба астывала, і пад раніцу тэмпература ў "галубятні", напэўна, не намнога адрознівалася ад вулічнай.

Па перыметры пакоя стаялі чатыры ложкі, засцеленыя дошкамі з сеннікамі. Падушкі і пасцельная бялізна былі ў кожнага свае, як і тое, чым можна было накрывацца. Каля акна стол з табурэткамі — і ўсё. Зімой мы спалі ва ўсім тым, у чым хадзілі ўдзень, галоўнае — не адмарозіць нос і вушы.

З гаспадыняй мы дамовіліся, што яна будзе гатаваць для нас на абед суп, па талерцы на едака. На тыдзень кожны па чарзе забяспечваў прыгатаванне супу, а гэта ў асноўным бульба, макарона, капуста і сала, каб засквабыць той суп. Хлеб у кожнага быў свой. Для мяне гэта была адзіная ежа на дзень, бо матэрыяльны стан у астатніх быў непараўнальна лепшы. Хлопцы ж гарадскія!

Помню, калі мы разлівалі гаршчок з супам па талерках, а суп варыўся к нашаму прыходу, дык адразу накідваліся на яго, елі апякаючыся, бо ніхто не хацеў заставацца апошнім. Мы аб'явілі "марскі закон": хто з'ядаў апошні, той павінен мыць посуд. Больш за ўсіх гэта даводзілася рабіць Васю Ціханенку, хаця ён стараўся, бедалага, не быць апошнім.

У тых цяжкіх умовах я стаў шукаць хоць якую-небудзь працу, каб неяк выжыць. Трэба было ўжо купляць алейныя фарбы і пэндзлі, бо на другім курсе пачынаўся алейны жывапіс. Праўда, бацька зрабіў мне эцюднік, дастаўшы ў райцэнтры фанеры, і складны мальберт па маіх чарцяжах. Эцюднік той не захаваўся, а мальберт і сёння знаходзіцца ў маёй майстэрні. Купіць жа гэтыя неабходныя прыстасаванні я не меў за што, як гэта рабілі іншыя студэнты.

Мае аднакашнікі параілі мне звярнуцца ў райкам камсамола, магчыма, там дапамогуць знайсці нейкую працу, якая б не замінала вучобе. Я зайшоў у Ленінскі райкам камсамола, які месціўся на рагу праспекта Леніна і вуліцы Я. Купалы. Трапіў да першага сакратара А. Сазановіча, вогненна-рыжага маладога хлопца (потым ён быў старшынёй Дзяржкамітэта па спорце), выклаў сваю просьбу. Калі я назваў прозвішча, ён, нахіліўшыся да другога чалавека, які сядзеў збоку, ціха яму сказаў: "Зноў Шаранговічы выпаўзаюць". Пачуўшы гэта, я адразу зразумеў, што мне тут ніхто не дапаможа. Нагадаю, ішоў 1956 год, Шаранговічы яшчэ не былі рэабілітаваныя, і я тады не ведаў, што засталося не так многа часу да іх рэабілітацыі.

Але мне пашчасціла ўжо з другога курса — некалькі студэнтаў вучылішча сталі статыстамі ў Вялікім тэатры оперы і балета, сярод іх аказаўся і я. Хто нас туды прывёў або параіў звярнуцца да адміністрацыі тэатра, я цяпер не памятаю. А можа, была аб'ява ў нашай вучэльні. Гэта была цікавая старонка ў маім жыцці, бо, з аднаго боку, можна было зарабіць невялікую капейчыну, а з другога — убачыць не толькі тэатральныя пастаноўкі з глядзельнай залы, але і тое, што робіцца за кулісамі. За ўдзел у масавай сцэне плацілі рубель; калі патрабавалася рэпетыцыя да выступлення, яшчэ рубель; калі павінен быць на пярэднім краі сцэны, як, напрыклад, ці то ў балеце "Эсмеральда" Ц.Пуні, ці то ў "Карсары" А.Адана давялося яшчэ з адным хлопцам фехтаваць на шпагах, за гэта плацілі два рублі. У "Дзяўчыне з Палесся" Я.Цікоцкага, калі быў забіты герой оперы, ад мяне патрабавалася зычна сказаць са сцэны: "Расцяпа камендант", — і цягнуць "забітага" за кулісы. Памятаю, партыю гэтага героя выконваў знакаміты тэнар Ісідар Балоцін, які лаяўся на мяне матам: маўляў, малады ды здаровы, выкручваю яму рукі.

Думаю, мне давалі такія даручэнні з-за таго, што быў рослым і даволі моцным хлопцам. Так паступова за месяц набягала ад 20 да 40 рублёў — такая-сякая дапамога для падтрымання жыцця. Але больш за гэта прыцягвала магчымасць паслухаць оперы і паглядзець балеты. Калі даводзілася быць статыстам, па заканчэнні сваёй "ролі" я прымошчваўся на вольнае месца ў зале і даглядваў пастаноўку да канца. Можна было таксама атрымаць кантрамарку і паглядзець з галёркі той ці іншы спектакль. Мне ўдалося прагледзець увесь рэпертуар Тэатра оперы і балета таго часу. Такая магчымасць мяне прасвятліла, развіла разуменне класічнай музыкі і яе прыгажосці, пашырыла маю агульную адукаванасць, хоць часткова, але зняла правінцыйную абмежаванасць.

Паслухаўшы столькі класічнай музыкі, я палюбіў яе ўсім сэрцам, менавіта з тых часоў яна запала мне ў душу, я пранёс гэтую любоў праз усё жыццё, і сёння яна мне найбольш блізкая. Хаця ў Оперны тэатр з тых часоў так часта не хадзіў.

Але ж не менш цікава было і за кулісамі. Мы павінны былі грыміравацца, апранацца ў адпаведныя касцюмы. Касцюмы тыя былі запыленыя, сто гадоў не мытыя, ад іх патыхала нафталінам і нечым яшчэ. Незлічоныя калідоры, заваленыя бутафорыяй, рознага кшталту памяшканні — лёгка можна было заблудзіцца, як у лесе. Падчас спектакля ўсюды бегаюць людзі, крычаць, лаюцца. Разабрацца, што да чаго, у мяне не было магчымасці, уражвала толькі вялікая розніца паміж тым, што адбывалася на сцэне і што рабілася за ёй.

Помніцца, стаіць за кулісамі І.Балоцін (а я быў непадалёк) перад выхадам, моцна сварыцца з другім артыстам, прычым, як цяпер кажуць, ужывае ненарматыўную лексіку. Раптам яму гавораць, што яго выхад. І ён, як нічога не было, выходзіць з-за куліс і прыгожым тэнарам зацягвае арыю. Я быў проста збянтэжаны і ашаломлены: як жа так, такое пераўвасабленне!

У той час, а гэта значыць у 1956—1958 гадах, у рэпертуары тэатра ішлі оперы: "Садко" М.Рымскага-Корсакава, "Князь Ігар" А.Барадзіна, "Страшны двор" С.Манюшкі, "Іван Сусанін" М.Глінкі, "Барыс Гадуноў" М.Мусаргскага, "Рыгалета" і "Травіята" Дж.Вердзі, "Мазепа", "Іаланта" П.Чайкоўскага, "Яснае світанне" А.Туранкова, прыгаданая "Дзяўчына з Палесся" Я.Цікоцкага, а таксама балеты — "Карсар" А.Адана, "Эсмеральда" Ц.Пуні, "Лебядзінае возера" і "Спячая прыгажуня" П.Чайкоўскага і многія іншыя шэдэўры сусветнай і нацыянальнай класікі.

А якія спевакі выступалі тады на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета: І.Балоцін, М.Дзянісаў, Н.Сярдобаў, М.Зюванаў, Р.Млодэк, С.Друкер, Т.Ніжнікава, салісты балета: С.Дрэчын, А.Нікалаева, В.Міронаў, Н.Давыдзенка і іншыя. Усіх пералічыць немагчыма, называю толькі тых, якія больш за іншых запомніліся.

Паступова мая "артыстычная" дзейнасць у Оперным тэатры стала затухаць, і трэба было шукаць іншыя магчымасці зарабіць на сваё існаванне. У вучылішчы былі дзве змены заняткаў па мастацкіх дысцыплінах, і я стаў прасіцца на другую змену натуршчыкам хаця б на адну ці дзве пастаноўкі. Становішча маё на той час было проста безвыходнае: наперадзе зіма, а боты знасіліся, з верхняй вопраткі толькі габардзінавы плашч, які бацька, акрамя сваіх інструментаў, прывёз з Германіі, ды і той ужо рвецца ад старасці.

* * *

Мяне вельмі ўразіў эпізод, які здарыўся, калі я прыехаў дадому на Кастрычніцкія святы. Восень выдалася вельмі халодная, ужо падмарожвала, зверху падаў мокры сняжок, неба шэра-стальное, пад нагамі хлюпае густая гразь. Лісце ўжо асыпалася, і лес навокал вёскі цёмны і пануры. Адпаведны і настрой, бо я прыехаў у ботах, якія даўно "есці просяць", ногі прамакаюць, а на плячах той самы тонкі нямецкі плашчык. Не дзіва і сур'ёзную хваробу падхапіць у такіх умовах!

А восенню ў вёсцы і з харчам бяда. Леташняе сала скончылася, карова амаль што не дае малака, куры не нясуцца. Дык што ж можна даць сыну ў дарогу? Бацька праводзіць мяне ў Зані, адкуль пойдзе калгасная "палундра" ў Мінск, а ехаць даводзецца ў кузаве. Ідзём праз амшару, і бацька мне гаворыць:

— Можа, Вася, я прадам карову, каб цябе трошкі прыадзець? Бо як жа ты ў Мінску перазімуеш?

І тут я раптам упершыню за сваё жыццё ўбачыў скупыя мужчынскія слёзы ў бацькавых вачах. Я ўжо казаў, што гэта быў жалезны чалавек, і ніколі не думаў, што ён можа заплакаць. Я разумеў: ён гатовы пайсці на такі крок з адчаю, безвыходнасці. Бо што такое селянін без каровы, а тут яшчэ трое малых дзяцей! Гэта пагібель для ўсіх. Я адказаў бацьку, што не дапушчу, каб дзеля мяне прадалі карову, пастараюся сам нейкім чынам зарабіць трохі грошай, каб купіць сабе паліто і боты! А калі нічога не атрымаецца, кіну вучылішча і прыеду дахаты.

Мне пашанцавала, і мяне ўзялі натуршчыкам на чацвёрты курс. Да абеду я маляваў і пісаў на сваім курсе, пасля абеду пазіраваў.

Узялі мяне хутчэй за ўсё з дабрачыннасці, бо фігура мая для малюнка ці жывапісу была, скажам шчыра, нікуды не вартая. Хударлявы, мускулаў аніякіх, ну зусім не Апалон Бельведэрскі, а пазіраваць трэба было агаленым. Але я тады адчуў, наколькі цяжкая праца натуршчыка. Была, ды і ёсць, беспадстаўная думка: маўляў, што гэта за работа — стаяць або сядзець. А паспрабуйце сорак пяць хвілін прастаяць ці прасядзець у пэўнай позе, не зварухнуўшыся, як застылая мумія! Гэта я добра адчуў на сабе і потым з вялікай павагай ставіўся да натуршчыкаў, калі вучыўся і калі на працягу многіх гадоў быў выкладчыкам.

Атрымаўшы трохі грошай, у нядзелю паехаў на "барахолку". Купіў паношанае карычневае паліто і боты. Ды зноў бяда: падсунулі дрэнныя боты, у аднаго з іх адразу стала адставаць падэшва. Спачатку падвязаў вяроўкай, пасля знайшоў некалькі цвічкоў, хоць часова, але прыбіў падэшву і дахадзіў так да канікулаў, калі бацька іх адрамантаваў.

Цяпер вернемся да заняткаў. Выкладчыкам на другім курсе, як потым і на трэцім, быў у нас Леў Маркавіч Лейтман. Знакаміты мастак, ён быў арыгінальным чалавекам і знешне, і ўнутрана. Худы, так што нават штаны трымаліся толькі на падцяжках, з выразным тварам і гаворкай местачковага яўрэя, трапным яўрэйскім гумарам. Л.М.Лейтман, як інтэлігентны добразычлівы чалавек, паважліва ставіўся да студэнтаў і заўсёды нешта гаварыў. Фігура выключна каларытная! Нездарма ж студэнт У.Лашкевіч часта ў адсутнасць Льва Маркавіча капіраваў яго звычкі пад агульны рогат.

Наш настаўнік, відаць, не вельмі добра ставіўся да савецкіх улад, мяркуючы па яго шматлікіх трапных выразах. Вось гэты афарызм я ўпершыню пачуў менавіта ад яго: "На тое яны і бальшавікі, каб спачатку ствараць цяжкасці, а пасля іх гераічна пераадольваць".

На другім курсе жывапіс алеем пачалі з нацюрмортаў. Я ўжо гаварыў, што за вучылішча алеем зрабіў толькі адну копію. Пасля акварэлі было нялёгка перайсці да алейнага жывапісу. Для другога ці трэцяга нацюрморта асноўнай драпіроўкай паслужыла маміна чорна-аранжавая посцілка. Нацюрморт быў вельмі цікавы, і я прынёс падрамнік з палатном памерам па большым боку каля метра. Ну і папакутаваў я над гэтым нацюрмортам, не маючы аніякага вопыту, ды яшчэ такая вялізная плошча, якую трэба пераадолець! Але я ніколі не любіў, каб за мяне рабіў нешта хто-небудзь іншы, — толькі сам. Буду мучыцца, перажываць, але даб'юся свайго. Гэта тычылася любой працы, а мастацтва тым больш. Вось падказкі, парады я ахвотна прымаў і прыслухоўваўся. Падчас пакутлівай працы над нацюрмортам Леў Маркавіч, бачачы мае няўмелыя намаганні, падыходзіць да мяне, бярэ пэндзлі і палітру і пачынае пісаць нейкі кавалак нацюрморта. Калі ён закончыў і перадаў мне палітру, я ў яго прысутнасці ўзяў мастыхін і моўчкі зняў усё тое, што напісаў выкладчык. Лейтман, нічога не сказаўшы, адышоў. Потым ён яшчэ раз паспрабаваў дапамагчы мне, назіраючы няўдалы ход работы, а я паўтарыў свой дэмарш. Пасля гэтага на працягу двух гадоў, якія выкладаў у нас Л.М.Лейтман, ён ні разу не ўзяў у мяне пэндзля, а толькі раіў і падказваў. Не абразіўся, а зразумеў, што да ўсяго я хачу дайсці сам. Ён быў сапраўдны педагог і чалавек!

(Працяг будзе.)

На Чыжоўскіх могілках пад Мінскам вандалы пашкодзілі 39 помнікаў

Аб здарэнні паведаміў вартаўнік могілак.

Цяпер міліцыянты распачалі крымінальную справу і шукаюць злачынцу.

Жыхар Наваполацка скраў царкоўны звон

32-гадовы жыхар Наваполацка падчас праваслаўнага кірмашу "Велікодная радасць" скраў з каркаса званіцы малы звон. Ён належаў Мінскай епархіі. Выкрадальніка па гарачых слядах затрымалі міліцыянты сумесна з ратавальнікамі.

БелаПАН.

Развітанне з радзімай Агінскага?

Наглядчыкі сядзібы Агінскага шукаюць пяць мільярдаў рублёў на аднаўленне занядбаных уладанняў вядомага кампазітара, паведамляе сайт ET CETERA.

Мястэчка Залессе каля Смаргоні, дзе нарадзіўся знакаміты паланез "Развітанне з Радзімай", зараз знаходзіцца ў аварыйным становішчы. Пры гэтым мясцовыя ўлады не могуць вызначыцца, хто аплаціць рамонт.

Міхал Клеафас Агінскі ў 1802 годзе разам з жонкай прыехаў пад Смаргонь з эміграцыі, пабудаваў тут сядзібу і заклаў парк. Зараз ад будынка засталіся толькі сцены, унутры — голы бетон. Апошнія рэстаўрацыйныя працы рабіліся 30 гадоў таму, яшчэ пры савецкай уладзе. Сцены падтрымліваюцца будаўнічымі рыштаваннямі.

Зараз Мінкульт перадае сядзібу на баланс Смаргонскага райвыканкама. Па ацэнцы загадчыка сядзібы Агінскіх Уладзіміра Ліхоты, на рэстаўрацыю патрэбна як мінімум 5 мільярдаў рублёў. Па яго словах, зараз адрэстаўраваная толькі каплічка, якая была калісьці сямейнай царквой Агінскіх, ды падтрымліваецца парк.

Свіны грып не схаваецца

Беларускія навукоўцы сцвярджаюць, што распрацавалі прэпарат, які выяўляе вірус H1N1.

"На гэта нам спатрэбілася 3 тыдні", — паведаміў дырэктар НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі **Леанід Цітоў**. Пра гэта паведамляе "Інтэрфакс".

"Гэты метад і прэпарат дазваляюць у выпадках завозу ў Беларусь дадзенага віду грыпу хутка яго выявіць", — зазначыў Цітоў.

Навуковец удакладніў, што можна будзе знайсці вірус грыпу *"ў арганізме чалавека ў вельмі нізкіх канцэнтрацыях"*.

Кровь на экспорт

Беларусь продает за рубеж часть запасов донорской крови для получения лекарств, сообщил директор Института биофизики и клеточной инженерии Национальной Академии наук Беларуси Игорь Волотовский.

"Беларусь поставляет за рубеж донорскую кровь. Это очень небольшие объемы. Кровь поставляется для производства лекарственных препаратов", — сообщил он, добавив при этом, что не видит в этом *"никаких этических проблем. За проданную кровь государство получает валюту"*.

Как сообщает interfax.by, Волотовский отметил, что *"если в Беларуси будут реализованы государственные научно-технические программы по биотехнологиям, то мы сможем сами производить лекарства на основе компонентов крови, которые сейчас закупаем за рубежом. И нам не надо будет продавать кровь"*.

СКАНДАЛ

Хто не хоча бачыць у Мінску беларусаў замежжа?

V з'езд беларусаў свету, арганізатарам якога выступае Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", мае адбыцца 18—19 ліпеня, але дагэтуль невядома, ці атрымаецца ўбеларусаў замежжа сустрэцца ў Беларусі. Васемнаццаць арганізацый Мінска адмовілі арганізатарам у памяшканні.

Намеснік старшыні "Бацькаўшчыны" Ніна Шыдлоўская не выключае, што галоўны форум беларускай дыяспары можа прайсці па-за межамі Беларусі. І дадае, што гэта самы апошні, самы непажаданы і самы скандальны варыянт.

— На мінулым тыдні нам адмовіла 18-я сталічная арганізацыя, куды мы звярталіся з просьбай арэнды залы, — Рэспубліканская мастацкая галерэя, — гаворыць Ніна Шыдлоўская. — Гэта вельмі дзіўна і нечакана, асабліва ўлічваючы той факт, што галерэя належыць Беларускаму саюзу мастакоў і там апошнім часам абсалютна беспярэшкодна праходзіла шмат імпрэз беларускіх грамадскіх аб'яднанняў, літаратурныя вечарыны, пасяджэнні ТБМ і іншыя мерапрыемствы. Папярэдне мы нават не разглядалі гэтае памяшканне, паколькі яно невялікае, а на з'езд збярэцца 400 дэлегатаў. Але калі апынуліся ў сітуацыі, калі нам усюды адмовілі, звярнуліся ў Галерэю і па тэлефоне атрымалі згоду на правядзенне там з'езда. Але ўжо на наступны дзень па факсе прыйшоў ліст за подпісам дырэктара прадпрыемства Зінкевіча, у якім сцвярджалася, што магчымасці прадаставіць "Бацькаўшчыне" памяшканне ў арэнду няма "ў сувязі з дзеяннем раней заключаных дамоў арэнды".

Хацела б падкрэсліць, што першай некачаканасцю было, калі нам адмовіў міжнародны адукацыйны цэнтр IBB. Менавіта там праходзіў папярэдні, IV з'езд беларусаў свету чатыры гады таму. Відавочна, што на будынкі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, мы не моцна разлічвалі, але калі адмовілі такія арганізацыі, як IBB, мастацкая галерэя, вельмі прыкра і дзіўна.

— А на што спасылаліся дзяржаўныя ўстановы?

— Прычыны, каб адмовіць, прыдумляліся розныя. Хто раптам, пасля нашага звароту, пачынаў рамонт будынка, некаторыя проста спасылаліся на адсутнасць магчымасцяў. Але па сутнасці фармулёўкі былі падобныя адна на адну.

Аднымі з першых нам адмовілі ў Кіраўніцтве справамі прэзідэнта, даслалі ліст, што ў іх няма памяшкання здаць нам у арэнду. Не знайшлося для нас залы ў Палацы Рэспублікі, Палацы прафсаюзаў, ДК МТЗ, ДК МАЗ, Доме афіцэраў. Нават у ВНУ — Лінгвістычным універсітэце, БДУ, дзе ў ліпені пэўнае зацішша, адмовілі.

— Зараз, калі амаль усе магчымасці і надзеі знайсці залу ў Мінску выкарыстаны, самым верагодным варыянтам правядзення форуму выглядае замежжа?

— Відавочна, што прыдатных памяшканняў застаецца ўсё менш і менш, і асноўныя з іх — усё роўна дзяржаўная прыватнасць. І сапраўды не такім ужо неверагодным выглядае варыянт правядзення З'езда беларусаў свету па-за межамі Беларусі. Сваю дапамогу прапанавалі нашы сябры з Літвы, Украіны, Польшчы... Але яшчэ ні разу галоўны форум беларускай дыяспары не праходзіў у замежжы. Гэта крайні варыянт, самы непажаданы і, пагадзіцеся, гэта скандал.

Цалкам у спрыяльных умовах адбываўся толькі першы з'езд. Гэта быў 1993 год, час адраджэння. Напярэдадні астатніх трох з'ездаў узнікалі праблемы з памяшканнем, нам прыходзілася прайсці колы пекла па ўзгадненні правядзення з'езда з рознымі ўстановамі кшталту МНС, але нават і тады не было такой сцяны, як зараз. І дзіўна, што гэта адбываецца менавіта цяпер, калі беларуская ўлада наладжвае стасункі з Еўропай. Такія дзеянні не на карысць іміджу дзяржавы.

Але мы ўсё роўна не губляем надзею правесці з'езд у Мінску. Апошнім тэрмінам вызначылі канец мая: калі да гэтага часу пытанне з памяшканнем не вырашыцца, усе арганізацыйныя высілкі перанясём на падрыхтоўку з'езда за мяжой. Для нас прынцыпова правесці з'езд у сталіцы. І хочацца верыць, што у нашых чыноўнікаў хопіць усведамлення значнасці сітуацыі. З'езд беларусаў свету — не проста статутнае мерапрыемства нашай арганізацыі. Гэта той міжнародны форум нашых суайчыннікаў, які заўсёды даваў магчымасць абмеркаваць надзённыя праблемы. У гэтым годзе заяўленая вельмі важная тэма форуму — "Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў у сучасным свеце: праблемы захавання і развіцця".

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

СЕМЕЙНЫЕ УЗЫ

Бабушка фаворита «Евровидения» живет в Витебске

Внештатному корреспонденту "Народной Воли" удалось встретиться с Марией Савицкой и узнать некоторые любопытные подробности из жизни Саши Рыбака и его родителей.

Мария Борисовна Савицкая родилась 84 года назад в маленьком городе Велиже Смоленской области, где ее дед, Николай Савицкий, служил настоятелем православного храма, за что и заплатил жизнью в период сталинских репрессий. Позднее, когда отец Марии перебрался с семьей в Витебск, Мария окончила здесь музыкальное училище по классу фортепиано, много лет преподавала в этом учебном заведении. Муж Марии Борисовны — коренной белорус по фамилии Рыбак, был офицером-десантником. В семье родились два сына. Но брак родителей распался. Оба сына получили образование в том же Витебском музыкальном училище, где преподавала М.Савицкая. Старший, Александр, поступил на факультет военных дирижеров Московской консерватории, остался в России, руководил военным оркестром и недавно вышел на пенсию в звании полковника. Младший, Игорь, скрипач, учился в Белорусской консерватории, по окончании которой работал в камерном оркестре под управлением Юрия Цирюка, с которым объездил весь СССР и почти всю Европу.

Успешно складывалась и личная жизнь Игоря. Его женой стала выпускница теоретического факультета БГК, прекрасная пианистка и музыкальный редактор БТ Наталья Гурина. 22 года назад у них родился сын Саша, которым теперь гордится вся Беларусь.

Но жизнь молодой семьи омрачалась неустроенностью быта. Втроем ютились в небольшой комнате коммунальной квартиры. Чтобы помочь сыну, Мария Борисовна разменяла свою просторную витебскую квартиру, а затем и сама переехала в Минск, где занялась воспитанием внука, а заодно и взяла на себя часть хозяйственных забот.

В смутное время перестройки Игорь попал с гастролирующим оркестром в Норвегию и, получив предложение о работе, не стал возвращаться в Союз. Около 7 лет он работал в Оперном театре, а затем, добившись признания и благополучия, основал в Осло частную музыкальную школу. И тогда в большом особняке, построенном Игорем Рыбаком на заработанные деньги, поселились вся семья, включая и вызванную из Беларуси Марию Борисовну.

Внук Марии Савицкой Александр Рыбак выиграл несколько национальных конкурсов как скрипач, а потом организовал эстрадную группу, которая исполняет его песни. По словам бабушки, ее поначалу тревожило то, что внук, воспитанный на классической музыкальной культуре, вносит в свое творчество элементы современной поп-музыки, но со временем поняла, что без уступок моде успех в шоу-бизнесе невозможен.

А успех у Александра в Норвегии велик. И бабушка, безусловно, гордится тем, что в свои 22 года внук зарабатывает столько, что смог на собственные деньги выпустить два диска с записями своих песен и сочинений для оркестра.

Вообще, вся семья Рыбаков популярна в столице Норвегии, стране потомственных тружеников моря. Марию Борисовну радует, что сын и невестка, совершенно освоившись в Норвегии, не забывают свою родную культуру. В "Русском клубе", издавна существующем в Осло, семья Рыбаков выступает как маленький музыкальный ансамбль, исполняя белорусские народные песни. Игорь играет на гитаре, Наталья — на фортепиано, а Саша — на скрипке. И, конечно же, все поют.

